

СЕЗОН КРЫЛАТАЙ ПАГРОЗЫ

4

ХТО АБАРОНІЦЬ ТУРЫСТА?

8




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЖНІЎНЯ 2018 г. СЕРАДА № 150 (28766)


## ЛІЧБА ДНЯ

**7,030 млрд долараў**

*(у эквіваленце) склалі, па папярэдніх даных, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 жніўня 2018 года, павялічыўшыся за ліпень на 198,8 млн долараў (на 2,9 %) пасля чэрвеньскага зніжэння на 108,2 мільёна, паведамляецца ў прэс-рэлізе Нацбанка. Павелічэнню ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў у ліпені спрыялі купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах БВФБ, паступленне валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, паступленне сродкаў ад продажу Нацбанкам і Мінфінам на ўнутраным рынку аблігацый, намінаваных у замежнай валюце. Урад і Нацыянальны банк у ліпені выканалі знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на суму каля 450 млн долараў.*



Фота БелТА.

# УСЁ ТРЭБА РАБІЦЬ РАЗУМНА І АДКАЗНА

### Уборку ўраджаю і павышэнне эфектыўнасці работы свабодных эканамічных зон абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта

**Перш чым пагаварыць на тэму СЭЗ, Прэзідэнт чарговы раз узняў найбольш актуальнае пытанне ўборкі ўраджаю. «Надвор'е, як я ўжо казаў, сёлета трошкі перабластала поры года, але тым не менш дрэннага надвор'я не бывае, — адзначыў беларускі лідар. — Натуральна, што таго ўраджаю, на які мы разлічвалі і закладвалі пад яго неабходны падмурак, мы не атрымаем, але яшчэ раз падкрэсліваю: недабор збажыны мы павінны папоўніць за кошт ураджаю кукурузы».**

СТАР. 2

# ШЧЫРАСЦЬ ДУШЫ — ШЧОДРАСЦЬ ЗЯМЛІ



**Жыхароў вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Мікалая і Алену ЯСКЕВІЧАЎ многія ў нашай краіне ведаюць як выключны самабытны сямейны дуэт. За выкананне палескіх балад у іх шмат узнагарод рознага кшталту. Але не многія ведаюць, што ў кожнага з сужэнцаў ёсць і дыплом аграрыя. На агародна-садовай ніве Яскевічаў сёлета небывалы ўраджай. Спачатку клубніцы, потым парэчкі і вішні, а цяпер спеюць дзясяткі сартоў груш і яблыкаў...**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Міністэрства інфармацыі Беларусі абмежавала доступ да 17 інтэрнэт-рэсурсаў за неналежную рэкламу.**
- Беларускія вайскоўцы атрымалі перамогу ў конкурсе Армейскіх міжнародных гульняў — 2018 «Снайперскі рубеж».
- **Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ», які пройдзе з 20 верасня да 16 кастрычніка ў Мінску, запрашае валанцёраў. Прэтэндэнтам неабходна запоўніць анкету валанцёра да 17 жніўня на сайце форуму.**



- Беларускія мытнікі за тыдзень спынілі 14 фактаў незаконнага перамяшчэння праз мяжу наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў.
- **З асаблівасцямі палявання XVII—XIX стагоддзяў пазнаёмяцца 18 жніўня госці экалагічнага фестывалю «Гамоняць пушчы беларускія...» у Свіслачы.**

ISSN 1990 - 763X

18150>

9 771990 763008

■ Першыя крокі ў прафесіі

# ШЧАСЦЕ НАВУЧАЦЬ

### Як маладому настаўніку не згарэць на рабоце і не збегчы са школы?



**15 жніўня ва ўстановы адукацыі прыйдуць некалькі тысяч маладых спецыялістаў — выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў універсітэтаў і каледжаў. Як правіла, перад кожным маладым педагогам паўстае мноства пытанняў. З чаго пачаць? Што сказаць вучням пры першай сустрэчы, калі застанешся сам-насам з некалькі дзясяткамі пар дапытлівых вачэй? Як выбудаваць узаемаадносіны з дзіцячым калектывам і зрабіць бацькоў вучняў сваімі саюзнікамі? Як прывычаіцца да новай сваёй ролі? Можна скончыць з «чырвоным дыпломам» універсітэт, атрымаць ступень магістра, але гэта зусім не гарантыя таго, што калі ты прыйдзеш у дзіцячую аўдыторыю, усё пойдзе як па масле. Дзіцячы калектыў — стыхія, якой трэба навучыцца кіраваць. У гэтым пераканалася настаўніца рускай мовы і літаратуры сталічнай гімназіі № 38 Анастасія ГАНЧАРОВА, якая чатыры гады таму таксама ўпершыню пераступіла парог школьнага класа як самастойны педагог. Пра свой перыяд адаптацыі ў настаўніцкім асяродку Анастасія шчыра расказала падчас педагагічнай майстэрні #ШчасцеНавучаць. Як яна сама заўважыла, захацела падзяліцца тым, чаму не вучаць у ВНУ. Насамрэч, ну навошта іншым наступаць на тыя ж самыя граблі?**

СТАР. 7

# УСЁ ТРЭБА РАБІЦЬ РАЗУМНА І АДКАЗНА

## Не могуць — аддайце тым, хто зробіць

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што збожжа нам неабходна, паколькі птушкагадоўля, свінагадоўля і іншыя галіны аграпрамысловасці, якія залежаць выключна ад камбікармоў і збожжа, у нас высокаразвітыя і іх неабходна забяспечыць адпаведнымі кармамі.

«Не хачу сказаць, што мяне насцярожваюць тэмпы ўборкі ўраджаю, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Такі ўраджай збожжавых мы, вядома ж, збяром. Гэта не праблема. Каля сямі мільёнаў тон — гэта не той узровень, які мы можам дасягнуць або рэалізаваць на ўборцы ўраджаю, паколькі тэхнічна аснашчаны як ніколі. Мы і дзесяць мільёнаў тон можам за месяц папросту ўбраць».

Беларускі лідар дадаў, што трэба хутчэй убіраць збожжавыя, трэба падрыхтавацца да азімай сяўбы, а самае галоўнае — выходзіць у поле на сяўбу тэхналагічна не гатовымі нельга.

«Хопіць ужо глупствам займацца і падманваць самых сябе. У пустую, як сяляне кажуць, у зямлю зерне класці злачынна. Падрыхтуйце як трэба глебу і пасейце ў агратэхнічныя аптымальныя тэрміны з поўным захаваннем агратэхнікі, — запатрабаваў Прэзідэнт. — Не паспяваеце — не рабіце».

Ён таксама звярнуўся да губернатараў: калі патрабаванне не выконваецца, то лепш аддаць гэтыя землі тым гаспадаркам і прадпрыемствам, якія маюць патрэбу ў збожжы. Аднак зрабіць гэта трэба зараз, каб была магчымасць своечасова падрыхтаваць глебу і пасеяць азімыя.

## На пульсе падзей

На нарадзе беларускі лідар закрануў тэму дзейнасці мясной і малочнай прамысловасці.

«Малако нас выратавала, — нагадаў ён. — Тое, пра што балбаталі нашы апазіцыянеры так званыя, тэхнолагі і палітыкі, аказалася проста глупствам. Мы, у свой час схапіўшыся за мадэрнізацыю нашых састарэлых ферм, малочнатаварных комплексаў, адносна выратавалі сельскую гаспадарку, паколькі малако сёння прыбытковае».

Задача — будаўніцтва комплексаў і мадэрнізацыя старых ферм, вызначана яшчэ пяць гадоў таму, — застаецца актуальнай у частцы недабудаваных малочнатаварных комплексаў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў нашай краіне ведаюць, як працаваць па птушкагадоўлі і свінагадоўлі. Ён таксама дадаў, што значнасць мяса і малака будзе ўзрастаць — перш за ўсё, на расійскім рынку. «Трэба быць гатовымі да гандлю на нашых асноўных рынках, але не забываць аб сваім унутраным рынку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар зноў звярнуў увагу: кан'юнктура рынку нядрэнная, але для таго, каб яе захаваць і быць там паспяховымі, трэба нарыхтаваць добрыя кармы.

«Сёння — я падкрэсліваю — уборка збажыны, але наперадзе ў нас яшчэ больш сур'ёзныя выпрабаванні. Чаму трэба сёння хутка скончыць — для таго, каб падрыхтаваць камбайны — тыя, якія будуць працаваць на ўборцы кукурузы — і сялян, механізатараў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што кукурузу страціць нельга.

## Сітуацыю вывучаць на месцах

Таксама кіраўнік дзяржавы нагадаў, што даручаў Ураду і асабіста намесніку прэм'ер-міністра Міхаілу Русаму вывучыць сітуацыю ў Гомельскай вобласці. «Што там за перакосы, што яна — па меншай меры, на час маёй камандзіроўкі на Віцебшчыну, на поўнач — адставала ва ўборцы ўраджаю збажыны, такога ніколі не было», — дадаў ён.

Аднак гэта асобная тэма, па якой хутка будзе далажана ў Гомелі, анансаваў свой візіт беларускі лідар.

Яшчэ адно анансаванае мерапрыемства — гэта, па словах Прэзідэнта, «лакмусавая паперка ў рабоце ўрада» — наведванне Оршы. Ён падкрэсліў: там павінны быць выкананы ўсе яго даручэнні. На думку беларускага лідара, гэта своеасаблівы маячок для такіх гарадоў, як Барысаў, Маладзечна, Бабруйск, Ліда і іншых — яны павінны быць выведзены на высокі ўзровень развіцця.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пытанне заключаецца ў правільным размяшчэнні прадукцыйных сіл. Калі скарачаць будаўніцтва жылля, а значыць, і прыток працоўнай сілы ў Мінск, то яна павінна быць раўнамерна размешчана па Беларусі, але не толькі ў абласных цэнтрах. Перш за ўсё — у буйных гарадах, якія будуць развівацца як аграпрамысловыя цэнтры, дадаў ён. Візіт Прэзідэнта ахопіць мноства самых розных сфер горада — ад культуры, спорту і вонкавага выгляду да вытворчасці і сацыяльнай прывабнасці.

## Пралічыць эфект

Далей Прэзідэнт перайшоў да тэмы свабодных эканамічных зон і адзначыў, што сёння для Беларусі як ніколі актуальныя пытанні стварэння новых высокапрадукцыйных працоўных месцаў, умацавання інтэлектуальнага, прамысловага і экспартнага патэнцыялу.

«Рашэнне гэтых задач непарыўна звязана з прыцягненнем інвестыцый у эканоміку нашай дзяржавы», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама нагадаў, што яшчэ ў 1998 годзе быў прыняты Закон «Аб свабодных эканамічных зонах» як адзін з інструментаў стварэння новых сучасных вытворчасцей. І ў цяперашні час у краіне функцыянуюць шэсць свабодных эканамічных зон, у якіх зарэгістравана 409 рэзідэнтаў з колькасцю працуючых больш за 122 тысячы чалавек.

Ён дадаў, што ўсе вобласці захацелі мець свае СЭЗ, хоць першапачаткова планавалі стварыць адну або дзве на ўсю краіну.

«Мне дакладваюць ва ўрадзе, што свабодныя эканамічныя зоны ўносяць істотны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў і краіны ў цэлым, фарміруючы аж 4 % ВУП, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Там сканцэнтравана амаль 13 % прамысловай вытворчасці, каля 16 % экспарту і каля 7 % прамых замежных інвестыцый».

«Напэўна, гэта важкі ўклад, але ці сувымерны ён з тымі льготамі, якія дадзены рэзідэнтам свабодных эканамічных зон?» — з такім пытаннем беларускі лідар звярнуўся да прысутных на нарадзе.

Прэзідэнт нагадаў, што раней ён даручаў вывучыць, ці патрэбныя краіне СЭЗ у тым выглядзе, у якім яны задумваліся, бо тады (у 1996—2002 гадах), паводле яго слоў, у людзей не было работы і даводзілася хапацца за любую саломінку, каб не патануць. Але сёння пытанне аб тым, каб проста заняць людзей у СЭЗ, даўшы там ільготны рэжым прадпрыемствам, не стаіць. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: мы спраўляемся з занятасцю людзей, нам патрэбныя высокатэхналагічныя вытворчасці, якія дадуць сінергетычны эфект на ўсю эканоміку.

Паводле яго слоў, у снежні 2016 года ўжо разглядаліся пытанні неабходнасці ўдасканалення прававога рэжыму работы СЭЗ у сувязі са зменай мытнага заканадаўства ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

Акрамя таго, дадаў кіраўнік дзяржавы, тады гучалі запэўніванні аб тым, што прапанаваныя меры дазволяць вырашыць праблемныя пытанні іх дзейнасці. Па выніках абмеркавання падыходы Савета Міністраў былі адобраны і падпісаны адпаведны ўказ.

«Сёння ўрад уносіць чарговыя прапановы, якія нібыта павінны стымуляваць развіццё нашых свабодных эканамічных зон», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт запатрабаваў ад удзельнікаў нарады адказаў на наступныя пытанні. Ці патрэбныя на сучасным этапе свабодныя эканамічныя зоны ў тым выглядзе, у якім яны існуюць? Наколькі эфектыўнымі аказаліся прынятыя ў канцы 2016 года меры і які вынік яны прынеслі эканоміцы Беларусі?

Апошняе пытанне ад кіраўніка дзяржавы прагучала так: ці дастаткова прапанаваных рашэнняў для развіцця СЭЗ і росту прамых замежных інвестыцый, або па заканчэнні некаторага часу будзе чарговы праект указа?



Збожжавыя актыўна ўбіраюць па ўсёй краіне.

Фота БелТА.

## СЭЗ нам патрэбныя

Як адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі, стварэнне свабодных эканамічных зон у Беларусі было накіравана на рашэнне актуальных задач развіцця: прыцягненне інвестыцый, стварэнне працоўных месцаў, нарошчванне экспартнага патэнцыялу.




«Вынікі дваццацігадовага перыяду функцыянавання СЭЗ сведчаць аб мэтазгоднасці іх стварэння і рэалізацыі тых задач, якія мы перад сабой ставілі», — падкрэсліў ён.

Па словах Васіля Мацюшэўскага, рэзідэнты СЭЗ уносяць істотны ўклад у асноўныя агульнарэспубліканскія макраэканамічныя паказчыкі. Займаючы нязначную частку краіны — 0,14 % плошчы — яны маюць долю ў 13 % вытворчасці прамысловай прадукцыі (у 2010 годзе было 5,8 %), 15 % экспарту па стане на канец 2017 года (6,9 % — у 2010 годзе), да 16 % прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове (3,2 % у 2010-м).

«Адзначаецца больш высокі ўзровень эфектыўнасці работы рэзідэнтаў СЭЗ у параўнанні з сярэднімі паказчыкамі па рэспубліцы, што пацвярджаецца больш высокімі паказчыкамі аб'ёмаў прамысловай вытворчасці і экспарту на аднаго занятага — па выніках 2017 года ў 3 і 3,7 раза адпаведна, — падкрэсліў першы намеснік прэм'ер-міністра. — Свабодныя эканамічныя зоны аказваюць істотны ўплыў і на рэгіянальныя паказчыкі. Напрыклад, за першы квартал 2018 года рэзідэнтамі СЭЗ «Магілёў» забяспечана 85 % усяго паступлення прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове Магілёўскага рэгіёна. СЭЗ «Брэст» — 64 % абласных паказчыкаў. Каля паловы экспарту тавараў адпаведнага рэгіёна забяспечана СЭЗ «Магілёў» і СЭЗ «Гроднаінвест».

Па выніках нарады Васіль Мацюшэўскі пагутарыў з журналістамі і падзяліўся прапанаванымі дапаўненнямі ўказа.

«Гаворка ішла не аб дадатковых прэферэнцыях, а ў першую чаргу па двух пытаннях — гэта дадатковыя крыніцы для стварэння інфраструктуры на новых участках СЭЗ, што звязана з газа- і электразабеспячэннем. І другое — пашырэнне шэрагу свабодных эканамічных зон па заяўках аблвыканкамаў і Адміністрацыі. Гэта новыя праекты, якія інвестары гатовы былі б рэалізаваць на тэрыторыі СЭЗ, — адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра. — Дастаткова глыбокая і грунтоўная размова [атрымалася. — **«Зв.»**], кіраўнік дзяржавы ў цэлым падтрымаў усё».

Васіль Мацюшэўскі падкрэсліў: інвестары гатовы ўкласці 850 млн долараў у стварэнне новых прадпрыемстваў на тэрыторыі свабодных эканамічных зон. «Гэта новыя заяўленыя праекты, пад якія мы разам з кіраўніцтвам абласцей прасілі аб магчымасці пашырыць свабодныя эканамічныя зоны», — дадаў ён.

Чакаецца, што дакумент у найбліжэйшы час будзе дапрацаваны і адпраўлены на подпіс Аляксандру Лукашэнку.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Абітурыент-2018

# У ЛІДАРАХ — МЫТНАЯ СПРАВА І КІТАЙСКАЯ МОВА

## У ВНУ падводзяць вынікі залічэння на платную форму навучання.

**Сярэдні конкурс у Белдзяржуніверсітэце на дзённую платную форму навучання склаў сёлета 1,5 чалавека на месца. Амаль 37 % абітурыентаў, залічаных на першы курс па агульным конкурсе па выніках ЦТ, маюць больш як 300 балаў (у 2017 годзе такіх было 28 %), а больш за 200 балаў маюць 94 % залічаных на першы курс.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У БДУ назвалі спецыяльнасці, дзе на платнай форме навучання склаліся самыя высокія прахадныя балы. Сярод прыродазнаўчых спецыяльнасцяў і дакладных навук гэта «прыкладная інфарматыка» — 305, «інфарматыка» — 301, «хімія лекавых злучэнняў» — 297, «камп'ютарная бяспека» — 291 і «фундаментальная хімія» — 289. Сярод сацыяльна-эканамічных і гуманітарных у лідарах «міжнароднае права» — 338, «міжнародныя адносіны» — 331, «лінгвакраіназнаўства» — 324, «інфармацыя і камунікацыі» — 321 і «сусветная эканоміка» — 305.

У БДУІР самы высокі прахадны бал — 317. Запатрабаванымі ў абітурыентаў, якія падалі дакументы на платную форму навучання, тут сталі IT-спецыяльнасці і спецыяльнасці інжынерна-эканамічнага профілю. Найбольш папулярныя — «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (317), «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (289), «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» (279). Заўважым, што на бюджэце рэйтынг спецыяльнасцяў узначаліла «эканоміка электроннага бізнесу» з прахадным балам 384.

У БНТУ на першым месцы ў абітурыентаў, якія паступалі на платныя месцы па выніках трох ЦТ, была «мытная справа»: прахадны бал на гэту спецыяльнасць — 257. На другім — «кіраванне дызайн-праектамі на прамысловым прадпрыемстве» (247) і «транспартная лагістыка» (247). Далей ідуць «бізнес-адміністраванне» (244 балы) і «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (243). А самыя нізкія балы на платнай форме навучання ў БНТУ склаліся на спецыяльнасцях «дызайн гусенічных і колавых машын» (усяго 99,7), «дызайн вытворчага абсталявання» (100,33), «прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» (103), «водазабеспячэнне, водаадвядзенне і ахова водных рэсурсаў» (106). Але на шэрагу спецыяльнасцяў конкурс увогуле не адбыўся, і на іх былі залічаны ўсе абітурыенты, якія падалі свае дакументы.

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце самых моцных абітурыентаў сабраў факультэт кітайскай мовы і культуры: на спецыяльнасці «кітайская мова» (спецыялізацыя — камп'ютарная лінгвістыка і руская мова як замежная) прахадны бал на платную форму навучання склаў 310, на спецыяльнасці «кітайская мова» (спецыялізацыя — спецыяльны пераклад) — 321 бал. А, напрыклад, на арабскую мову (спецыяльны пераклад) дастаткова было набраць 194 балы, хоць на бюджэтнай форме навучання прахадны бал тут быў 351.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## У СТАЛІЦЫ ПРОЙДУЦЬ МІНІ-КІРМАШЫ ВАКАНСІЙ

### Патрэбны маляры і бетоншчыкі

**Гэтым разам работнікаў шукаюць прадпрыемствы «Беларускія латарэі» і «Мінтэхбуд». Першы наймальнік мае патрэбу ў прадаўцах, другі — у малярах, бетоншчыках, цеслярах, страхарах, арматуршчыках. Пра гэта паведамляе камітэт па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама.**

Сёння міні-кірмаш вакансій пройдзе ў аддзеле абслугоўвання грамадзян № 1 (вуліца Я. Коласа, 69) з 10 да 12 гадзін. Заўтра, 9 жніўня, пра свабодныя працоўныя месцы можна будзе даведацца ў аддзеле абслугоўвання грамадзян № 3 (вуліца Шчарбакова, 32), час той жа.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## ЖАНЧЫНА СПАЛЬВАЛА СМЕЦЦЕ І ПАДПАЛІЛА ПОЛЕ

**3 жніўня ў Навагрудскую цэнтральную раённую бальніцу ў цяжкім стане экстранна шпіталізавалі 80-гадовую старую з вёскі Антонаўшчына. Яна апякла 30 % цела.**

Па звестках прэс-службы МНС, бабуля спальвала смецце на сваім прысядзібным участку, які знаходзіцца каля поля. У нейкі момант яна недагледзела за агнём, і ён перакінуўся на пажніўныя рэшткі. Пенсіянерка пачала тушыць полымя, але знепрытомнела і зваліася ў агонь.

Ратавальнікі нагадваюць правілы паводзінаў у падобных сітуацыях. Калі гарыць трава, варта ацаніць сітуацыю і магчымую рызыку і набраць нумар 101. А пакуль прыедзе экіпаж МНС, можна пачаць тушыць агонь самому, збіваючы яго галінамі і заліваючы вадой.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ЗОРКУ ФІЛЬМАЎ «ТАКСІ» САМІ НАСЕРЫ ЗБІЛІ Ў МАСКОЎСКІМ КАРАОКЕ-КЛУБЕ

**Паводле звестак расійскага «Федэральнага агенцтва навінаў», цялесныя пашкоджанні акцёру нанеслі прыезджыя з Беларусі.**



Выканаўца ролі марсельскага таксіста Даніэля Маралеса ў першых чатырох частках вядомай франшызы «Таксі» Самі Насеры разам з братам Бібі, таксама акцёрам, ужо каля года жыве ў Расіі і плануе здымаць тут фільм паводле сцэнарыя брата.

У непрыемную сітуацыю Насеры трапіў у ноч на 5 жніўня ў маскоўскім караоке-бары Voice. Прычынай канфлікту паміж «таксістам» берберскага паходжання і беларусамі сведкі называюць занадта шумныя паводзіны французскай кампаніі. Іншыя наведвальнікі зрабілі ім заўвагу, а неўзабаве ўзаемныя знявагі перайшлі ў бойку.

Але існуе і другая версія здарэння — нібыта Насеры не падзяліў мікрафон караоке-бара з іншым ахвотным пасляваць.

У выніку Насеры вымушаны быў звярнуцца ў НДІ хуткай дапамогі імя Скліфасоўскага, дзе ў яго дыягнаставалі чэрапна-мазгавую траўму. Зрэшты, праз некалькі гадзін 57-гадовы акцёр вярнуўся са шпіталя дадому. Маскоўская паліцыя высвятляе абставіны інцыдэнту.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## УКРАЛА З КВАТЭРЫ 1700 ДОЛАРАЎ

**У Ленінскае РУУС сталіцы паступіла заява ад жыхара горада з просьбай устанавіць і прыцягнуць да крымінальнай адказнасці асобу, якая здзейсніла крадзеж 1700 долараў з яго кватэры.**

Міліцыянеры ўстанавілі, што да здзяйснення злачынства датычная 39-гадовая жыхарка Гомеля. Зламысніца прыехала ў сталіцу з мэтай знайсці работу. Для часовага пражывання знайшла па аб'яве пакой, які дамовілася здымаць у пажылой жанчыны.

Падчас размовы з пенсіянеркай прыезджая высвятляла інфармацыю пра родных першай. Так падазраваная даведалася, што сын гаспадыні кватэры жыве ў суседнім двары. Перыядычна ў гутарках жанчына спрабавала высветліць дакладны адрас яго кватэры. Калі ад пенсіянеркі пачула, што сын з'язджае за межы горада, украла з сумачкі пажылой гаспадыні ключы, пасля чаго патрапіла ў кватэру пацярпелага. З жылля яна ўкрала 1700 долараў і з'ехала ў Гомель. Па інфармацыі Ленінскага РУУС Мінска, жанчына пазбаўлена бацькоўскіх правоў. Калі пазычала грошы ў гаспадыні кватэры, тлумачыла, што перасылае іх дзецям. Вядома, што падазраваная неадноўчы траплялa ў поле зроку міліцыі.

## ПЯКЕЛЬНАЯ РЭЎНАСЦЬ

**Суд Полацкага раёна і горада Полацка прызнаў жанчыну, якая з-за рэўнасці падпаліла кватэру знаёмай, вінаватай у наўмысным пашкоджанні маёмасці і прызначыў ёй пакаранне ў выглядзе чатырох гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.**

Як паведамляе прэс-служба абласной пракуратуры, 40-гадовая жыхарка Полацкага раёна ў канцы сакавіка ў стане алкагольнага ап'янення падпаліла ўваходныя дзверы кватэры знаёмай. Абвінавачаная была ўпэўненая ў адсутнасці людзей у кватэры, да гаспадыні якой яна адчувала асабістую непрыязнасць з-за рэўнасці да мужчыны. Суседзі аператыўна ліквідавалі ачаг узгарання. У той дзень гаспадыня кватэры і яе дзеці адсутнічалі дома. Шкода была нанесена толькі маёмасці. Апроч гэтага пакарання жанчына пройдзе прымусовае лячэнне. У лік пакрыцця матэрыяльнай шкоды яна абавязана выплаціць пацярпелай 830 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ЕЎРАСАЮЗ ЗАБЛАКАВАЎ САНКЦЫІ ЗША СУПРАЦЬ ІРАНА



Еўрасаюз увёў у дзеянне еўрапейскі блакавальны рэгламент, які аб'яўляе несапраўднымі на яго тэрыторыі санкцыі ЗША ў дачыненні да Ірана, забараняе еўрапейскім кампаніям іх выконваць, а таксама забараняе выкананне любых рашэнняў замежных судоў, прынятых на падставе гэтых санкцый. Як паведаміла Еўракамісія, блакавальны рэгламент уведзены ў дзеянне аўтаматычна ў 6:00 (7:00 па мінскім часе) 7 жніўня. «Блакавальны статус дазволіць усім еўрапейскім арганізацыям у судовым парадку кампенсаваць шкоду ад выканання санкцый ад асоб, па віне якіх гэта адбылося», — заявіла на брыфінгу ў Брусэлі афіцыйны прадстаўнік Еўракамісіі Міна Андрэева. Як пазней растлумачылі эксперты Еўракамісіі, рэгламент таксама дапускае атрыманне кампенсацый еўрапейскімі кампаніямі, якія могуць панесці страты ў выніку дзеянняў ЗША. З гэтага часу кампаніям трэба атрымаць адмысловы дазвол Еўракамісіі, які будзе выдавацца для кожнага выпадку асобна і толькі ў выключным парадку, калі яны змогуць пацвердзіць, што «невыкананне санкцый можа нанесці сур'ёзны ўрон інтарэсам еўрапейскіх кампаній або Еўрасаюза ў цэлым», растлумачылі эксперты Еўракамісіі.

## ПАЖАРЫ Ў КАЛІФОРНІІ ТУШАЦЬ БОЛЬШ ЗА 14 ТЫСЯЧ РАТАВАЛЬНІКАЎ



Больш за 14 тысяч пажарных удзельнічаюць у тушэнні прыроднага пажару, што бушуе на тэрыторыі амерыканскага штата Каліфорнія, паведамляе газета Washington Post. Плошча пажару перавысіла 114 тысяч 850 гектараў — як заўважыў тэлеканал NBC News са спасылкай на мясцовыя ўлады, вогненнае бедства стала наймбуйнейшым у сучаснай гісторыі гэтага амерыканскага штата. За тыдзень агонь ахапіў значную тэрыторыю ў акругах Лэйк і Мендасіна. Полымя знішчыла больш за 70 жылых дамоў і пагражае 11 тысячам будынкаў. Пажар удалося лакалізаваць толькі на трэць. Дагэтуль самым буйным па плошчы ў Каліфорніі лічыўся пажар, які ўзнік у акрузе Вентура 4 снежня мінулага года і атрымаў назву «Томас». Яго максімальная плошча склала 114 тысяч 78 гектараў. Тады ахвярамі стыхіі сталі два чалавекі, больш за тысячу дамоў былі знішчаны. Шкода, нанесеная «Томасам», паводле ацэнак улад, склала каля 150 млн долараў. Цяпер у Каліфорніі бушуе больш за дзясятак лясных пажараў рознай плошчы. Іх ахвярамі сталі шэсць чалавек, яшчэ сем прапалі без вестак. Усяго з зон, ахопленых стыхіяй, эвакуіраваныя некалькі дзясяткаў тысяч чалавек. У штаце аб'яўлена надзвычайная сітуацыя.

## КІТАЙ ПРАВЁЎ ПАСПЯХОВАЕ ВЫПРАБАВАННЕ ПЕРШАГА ГІПЕРГУКАВОГА ЛЯТАЛЬНАГА АПАРАТА



У Кітаі паспяхова выпрабавалі гіпергукавы лятальны апарат «Сінкун-2» («Зорнае неба-2»). Пра гэта гаворыцца ў паведамленні Кітайскай акадэміі аэракасмічнай аэрадынамікі, на якое спасылаецца РІА «Навіны». «Сінкун-2» — хваляплан, які атрымлівае паскарэнне дзякуючы ўдарным хвалям, што ўтвараюцца пасля праходжання гукавога бар'ера. На яго распрацоўку пайшло тры гады. Як піша газета Global Times са спасылкай на кітайскіх ваенных экспертаў, апарат здольны дастаўляць ядзерныя боегалоўкі і пераадольваць любую існуючую цяпер сістэму супрацьракетнай абароны дзякуючы высокай хуткасці (звыш 7,1 тысячы кіламетраў у гадзіну) і непрадказальнай траекторыі.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ПАГРОЗА З ДЖАЛАМ

## Як засцерагчыся ад крылатых агрэсараў?

**Цёплым летнім вечарам экіпаж МНС прыязджае ў сталічны дзіцячы садок на вуліцы Берута. Дзеці даўно пайшлі дадому. На тэрыторыі садка нас сустракае вартаўнік Аляксандр ФІЛІМОНАЎ і тут жа вядзе паказваць асінае гняздо. Як па іроніі лёсу, восы носяцца на брыючым палёце перад каменем з надпісам «Сцеражыце прыроду». Гняздо размясцілася пад «тэматычным валуном».**

— Толькі тры дні таму касіў траву, і нічога ж не было. Хоць бы адна праляцела! А цяпер — самі бачыце. І так кожны год да нас прыязджаюць ліквідаваць гнёзды насякомых. Адкуль іх толькі не выкурвалі — і з-пад ганка, і з-пад казырка. Выберуць жа месца, куды ніхто далезці не можа, і селяцца там. Летась у нас працаваў цясляр, дык яго нават уджалілі. Шчасце, што ўсё абышлося.

Тым часам да каменя падыходзіць разлік ратавальнікаў. Абодва яны апрануты ў спецыяльныя абаронча касцюмы. На тварах — маскі пчаляроў. Адзін нясе нейкую трубу, якая аддалена нагадвае пыласос.

— Зараз нашы байцы пачнуць хімічную атаку: зальюць туды дыхлафос і крыху пачакаюць, — кажа **начальнік змены пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада Андрэй САПЕГА.** — Восы ўнутры згубяць актыўнасць. Хвілін праз пятнаццаць мы іх адтуль выдзьмем гэтым пыласосам. Унутры яго стаяць нажы, якія перамолваюць усё, што на іх трапляе... Мы самі толькі што прыехалі з ліквідацыі яшчэ аднаго гнязда. Восы пасяліліся ў шафцы на балконе адной з гарадскіх кватэр. Яшчэ не так даўно ліквідавалі вос пад дэкаратыўнай абшыўкай на балконе. А вось пад каменем у зямлі, што цікава, яны гняздзяцца нячаста. Затое восы вельмі любяць карпусы дзіцячых садкоў. Там шмат вокнаў, адтулін... Выезды па такіх выкліках у нас пачынаюцца яшчэ ўвесну. Красавік і май — час пчол. Восы пачынаюцца недзе ў чэрвені. Летась пік прыйшоўся ўвогуле на верасень, які выдаўся нечакана цёплым.

Праходзіць пятнаццаць хвілін, і пачынае гудзець пыласос. Праз колькі часу ўсё скончана. Так адной пагрозай стала меней...

### ТЫСЯЧЫ ВЫЕЗДАЎ

Жнівень — час не толькі збору ўраджаю, але і вельмі высокай актыўнасці небяспечных насякомых — пчол, вос і шэршняў. Яны ляцяць на ўсё салодкае, і таму напусціць поўную кухню паласатых агрэсараў можна нават пры варцы варэння, забыўшы зачыніць акно. Але калі іншыя лятаючыя істоты прамой небяспекі для чалавека не ўяўляюць, то кантакт з перапончатакрылымі можа стаць апошнім у жыцці.

— Толькі лічбы: за мінулы год на ліквідацыю гнёздаў атрутных насякомых нашы падраздзяленні выязджалі 6 тысяч 394 разы! — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Сёлета за першыя паўгода ратавальнікі прыбралі ўжо 1065 гнёздаў. Здзіўляцца такой разбежцы не варта. Пік актыўнасці джаланосных прыходзіцца на ліпень, жнівень і пры спрыяльных умовах надвор'я можа яшчэ захапіць і верасень. Сёлета на актыўнасць гудуноў station... 

па паўплываў і май, які нечакана аказаўся дадатковым летнім месяцам.

Ёсць адзін нюанс у ліквідацыі гнёздаў ратавальнікамі. Прамы абавязак гаспадара — сачыць за парадкам у сябе дома і на прысядзібным участку. Там, дзе не дайшлі рукі, і трэба чакаць няпрошаных паласатых гасцей. Таму ў некаторых выпадках прыбіранне гнязда супрацоўнікамі МНС будзе каштаваць грошай. Дакладная сума, аднак, складваецца з многіх кампанентаў, у ліку якіх — далёкасць выезду, патрачаны час. Пры гэтым гаворка не ідзе аб тым, каб зарабіць грошы. Мы проста хочам кампенсаваць нашы выдаткі на гэтыя работы. Аднак калі існуе прамая пагроза жыццю і здароўю людзей, то дапамогу акажуць бясплатна. Напрыклад, гняздо знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад людзей, дзяцей, пры ўваходзе ў дом ці ў дзіцячых садках...

А што рабіць, калі перапончатакрылыя завяліся, напрыклад, на гарышчы шматпавярховага дома? У такім разе месца агульнага карыстання недагледзелі супрацоўнікі абслуговых арганізацый. Звычайных жыхароў гэта хваляваць не павінна.

Гняздо небяспечных насякомых з'яўляецца не за адзін дзень. Сваё жыллё яны будуюць каля месяца. Іх улюбёныя месцы — дуплы дрэў, гарышчы, пуні, куды рэдка заходзяць людзі, дзе цёпла і ціха. У гарадской шматпавярховай забудове — гэта балконы, лоджыі, тэхнічныя памяшканні. Таму ўсе такія лакацыі трэба перыядычна правяраць. З экзатычных месцаў, якія любяць восы, — прасценак у драўляным доме, абкладзеным цэглай. Восъ і паспрабуйце іх адтуль выкурыць.

Калі ж вы ўбачылі гняздо, то адступайце ад яго павольна. Асабліва гэта датычыцца шэршняў, чые ўкусы куды больш небяспечныя за асіныя. Бяспечная зона — прыкладна 50 метраў.

Разам з тым пазбавіцца ад гнязда можна і самому. Акрамя вельмі шчыльнай экіпіроўкі, як апісана вышэй, трэба захапіць з сабой мяшок і рыдлёўку. Выпраўляцца на ліквідацыю толькі пасля заходу сонца. Затым перарэзаць гняздо пад коранем, каб яно тут жа ўпала ў мяшок, моцна завязаць і далей закапаць, спаліць, утапіць — выбар неабмежаваны. Разам з тым калі гняздо занадта вялікае і па памерах набліжаецца да футбольнага мяча, то лепш усё-такі скарыстацца паслугамі ратавальнікаў.



### МОЖА БЫЦЬ ШОК...

— Калі да вас прычапілася аса ці пчала, то рэзкіх рухаў рабіць не пажадана. Проста адмахніцеся, і яна адляціць. А небяспеку насякомыя ўяўляюць, калі знаходзяцца паблізу ад гнязда. У іх спрацоўвае інстынкт абароны, — працягвае Віталь Навіцкі.

Здараюцца выпадкі, калі нехта кусае фрукт або выпівае шклянку соку... разам з асой. Такія ўкусы ў слізістую абалонку найбольш небяспечныя, бо могуць прывесці да цяжкіх наступстваў нават у чалавека, у якога як быццам і няма алергічных рэакцый.

Нават ад аднаго ўкусу ў чалавека можа развіцца анафілактычны шок. Гэта неадэкватная рэакцыя арганізма на пэўны алерген, якім і з'яўляецца атрута на джалах насякомых. Пачынаецца шок з рэзкага болю, моцнага ацёку, свербу скуры і рэзкага падзення артэрыяльнага ціску. На працягу некалькіх хвілін ён можа прывесці да смерці. Выратаваць чалавека можа толькі неадкладны выклік хуткай дапамогі. Але пакуль урачы прыедуць, сёе-тое можна зрабіць і тым, хто знаходзіцца побач. Перш за ўсё трэба як мага хутчэй выдаліць са скуры джала. Яго можна саскрэбці пазногцем, тупым бокам ляза нажа, пінцэтам і нават банкаўскай карткай. Дайце пацярпеламу любы супрацьалергенны прэпарат і прыкладзіце што-небудзь халоднае. Калі чалавек у непрытомнасці — прыдайце стабільнае становішча на баку.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

КРЫМІНАЛ ЗДАРЭННІ КРЫМІНАЛ ЗДАРЭННІ КРЫМІНАЛ ЗДАРЭННІ

## Двойчы трапіла пад колы

**На трасе М1 жанчына памерла пасля двайнога наезду.**

Як паведамілі ва УДАІ УУС Мінскага аблвыканкама, аварыя на 272-м кіламетры дарогі Брэст — Мінск — граніца Расіі паблізу вёскі Залужжа Стаўбцоўскага раёна адбылася прыблізна ў 23.20. Мінчанін за рулём Nissan Almera збіў 39-гадовую жыхарку раёна, якая знаходзілася на праезнай частцы. Пасля чаго на пешахода здзейсніў наезд Renault Megane. У выніку дарожна-транспартнага здарэння жанчына ад атрыманых цялесных пашкоджанняў памерла на месцы.

Па інфармацыі ДАІ, участак праезнай часткі не асвятляўся, пешаход сваятлоадбівальнымі элементамі пазначана не была.

## На водных аб'ектах — чарговыя трагедыі

**Пад Смаргонню мужчына пры купанні выратаваў дачку, але сам патануў.**

Па інфармацыі ўпраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці, побач з вёскай Завелле падчас купання ў Віліі не разлічылі ўласныя сілы бацька і дачка са Смаргоні. Супраціўляючыся цячэнню, 50-гадовы мужчына здолеў выпхнуць дачку з магутнай бруі і выратаваць ёй жыццё. А сам дабрацца да берага не здолеў... У гэты ж дзень на Нёмане паблізу вуліцы Падольнай у Гродне было знойдзена цела 18-гадовага жыхара Шчучына. Для купання гэты ўчастак ракі не прызначаны. Цяпер следчыя высвятляюць, пры якіх абставінах патануў хлопец. Трагедыяй скончыўся адпачынак на возеры Малочным побач з аграгарадком Парэчча для 38-гадовай жыхаркі Гродна. Следчыя высветлілі, што перад тым, як зайсці ў ваду, яна ўжывала алкаголь са знаёмымі.

У час купання ў Нёмане каля вёскі Міхайлаўка Гродзенскага раёна патануў 45-гадовы жыхар Скідзеля. Перад заплывам мужчына разам з сябрам ужываў піва. У гэты ж дзень у возеры побач з населеным пунктам Бобра Шчучынскага раёна было знойдзена цела 52-гадовага жыхара аграгарадка Ражанка. Высветлілася, што мужчына плаваў, нягледзячы на наяўнасць устаноўленых на беразе таблічак аб забароне купання.

А ў Рэчыцкім раёне цячэннем ракі знесла дзяўчынку і мужчыну. Усё адбылося ўвечары паблізу вёскі Горваль. Мужчына, жанчына і дзве дзяўчынкі 11 гадоў выправіліся на Бярэзіну. Папярэдне ўстаноўлена, што спачатку яны ішлі па мелкаводдзі, а затым патрапілі ў цячэнне. Жанчына і адна дзяўчынка змаглі выбрацца, а мужчыну і другое дзіця знесла цячэннем... На момант падрыхтоўкі інфармацыі іх пошукамі працягвалі займацца ратавальнікі...

У Следчым камітэце нагадваюць асноўныя правілы паводзінаў на вадзе. Перш за ўсё можна купацца толькі ў дазволеных месцах, не ныраць у незнаёмых, не заходзіць, не заплываць на глыбокае месца, далёка ад берага. Не варта ўжываць спіртныя напоі, нават знаходзячыся побач з вадой.

## Хлопчык хлёбнуў кіслаты...

**У Горках аднагадовы хлопчык атрымаў хімічны апёк, пераблытаўшы кіслату з газіроўкай. Бабуля дзіцяці пачула рэзкі плач і ўбачыла ў яго ў руках пустую бутэльку ад напою. У ёй захоўвалася кіслата, якой за тыдзень да здарэння бацькі хлопчыка чысцілі трубы. З хімічнымі апёкамі поласці рота і стрававода дзіця было шпіталізавана.**

У Следчым камітэце звяртаюць увагу, што на мінулым тыдні ў Беларусі адбылося шэраг няшчасных выпадкаў з дзецьмі. Так, у гарадскім пасёлку Рось Ваўкавыскага раёна 11-гадовы хлопчык разам з іншымі дзецьмі гуляў на мануменце. У нейкі момант ён, знаходзячыся на вышыні 2,5 метра, адчуў недамаганне і ўпаў, атрымаўшы траўмы рознай ступені цяжкасці. У Белаазёрску Брэсцкай вобласці з акна трэцяга паверха жылога дома выпала 4-гадовая дзяўчынка. Яна забралася на падаконнік адчыненага акна, абаперлася на маскітную сетку, разам з якой і выпала.

Следчыя нагадваюць бацькам аб недапушчальнасці захоўвання вадкасцяў, якія ўяўляюць небяспеку, у даступных для дзяцей месцах. Варта абмежаваць доступ і да электрычных бытавых прыбораў, да адкрытых крыніц павышанай тэмпературы і агню. Нельга пакідаць дзяцей адных у памяшканнях з адчыненымі вокнамі.

## Куды прапаў ключ ад горада?

**У Віцебску знік сімвалічны ключ ад горада, які быў устаноўлены на манументальна-дэкаратыўнай скульптуры «Рыбка», паведамляе БелТА. Скульптура стаіць побач з месцам упадзення Віцьбы ў Заходнюю Дзвіну на вуліцы Талстога.**

Жыхары горада звярнулі ўвагу на тое, што рыбка да нядаўняга часу трымала ў роце ключ з надпісам «Віцебск» і выявай герба горада. Цяпер ключ знік, калі менавіта гэта адбылося, невядома. Па інфармацыі УУС Віцебскага аблвыканкама, следча-аператыўная група Кастрычніцкага РАУС агледзела месца здарэння, зараз даецца прававвая ацэнка таму, што адбылося. Месца каля «Рыбкі» вельмі папулярнае ў жыхароў і гасцей горада, тут часта фатаграфуюцца маладыя. Таму міліцыя для ўстанаўлення даты знікнення ключа звяртаецца з просьбай да тых, хто валодае нядаўнімі фота ці відэа з гэтага месца, на якіх бачны ключ, расказаць, у якія дні ён яшчэ быў на скульптуры. Апошнюю адкрылі ў Віцебску 23 чэрвеня 2017 года ў Дзень горада. Рыбка сімвалізуе адзін з традыцыйных промыслаў, а ўстаноўлена яна побач з месцам, дзе па легендзе быў закладзены старажытны Віцебск. З'яўленне такой скульптуры тлумачыцца яшчэ і тым, што Віцебск двойчы праездам наведваў аўтар казкі пра залатую рыбку Аляксандр Пушкін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Будаўніцтва

# ПЕРСПЕКТЫВЫ Ў «КВАДРАЦЕ»

## Да канца года для шматдзетных сем'яў узвядуць больш за сем тысяч кватэр

**Для гэтай катэгорыі грамадзян ужо здадзена 240 тыс. квадратных метраў жылля. Сёння Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва працуе над тым, каб кожны год наваселле святкавалі не менш, чым у дзесяці тысячах новых кватэр, здадзеных для шматдзетных сем'яў. Пра магчымасці развіцця галіны падчас прэс-канферэнцыі расказаў кіраўнік ведамства Анатоль ЧОРНЫ. Традыцыйна напярэдадні прафесійнага свята (яго будуць адзначаць у нядзелю) будаўнічая галіна падводзіць прамежкавыя вынікі сваёй працы.**

Сёлета будаўнічы комплекс краіны выйшаў на станоўчую дынаміку. Будаўніча-мантажныя работы выраслі да 108 % ад узроўню мінулага года і склалі больш за 5 млрд рублёў. Удалося выйсці на станоўчы ўнёсак і ў ВУП — плюс 0,4 пункта. Задача для ведамства на год — узвесці 4 млн квадратных метраў жылля, ужо пабудавана больш за 1,6 млн.

Па словах Анатоля Чорнага, прырасла галіна і ў экспарце. Па некаторых пазіцыях — шкло, керамічная плітка — прадаюць за мяжу да 90 % прадукцыі.

«Цэменту мы прадаём да 50 % пры максімальным экспарце. У асноўным цяпер да 35 % з улікам таго, што ўнутранае будаўніцтва падымаецца, аб'ёмы спажывання павялічваюцца, таму скарацілі экспарт і больш увагі ўдзяляем унутранаму рынку», — сказаў міністр.

Сёння будаўнікі шукаюць магчымасці выхаду на новыя рынкі па экспарце паслуг. Асноўную канкурэнцыю складаюць буйныя міжнародныя карпарацыі. Яны маюць магчымасць укладаць уласныя інвестыцыі, што найбольш прывабна для патэнцыйных спажыўцоў.

«Сёння ў нас ёсць напрацоўкі па ўласных інвестыцыях. Мы, карыстаючыся 534-м Указам, ужо рэалізавалі пілотны праект у Расійскай Федэрацыі. Гэта будаўніцтва школы і дзіцячых садкоў. Сёння школа на 1000 месцаў узведзена ў Калузе. Заключаецца гэты падыход у наступным. Мы крэдытуемся ў Рэспубліцы Беларусь па 534-м Указе, будуем школу, потым яе ацэньваем, рэалізоўваем, разлічваемся з Банкам развіцця, страхавымі кампаніямі. Астатнія сродкі — гэта даход прадпрыемстваў, якія працуюць на экспарце. Тым самым мы змаглі задзейнічаць катэгорыю будаўнікоў, якія не былі загружаны ў нашай краіне, і далі магчымасць ім атрымаць дастойную заработную плату», — расказаў міністр. Такім падыходам да работы ўжо зацікавіліся партнёры і на Афрыканскім кантыненце.

Па словах міністра, дырэктыўна абмяжоўваць будаўніцтва жылля ў сталіцы не будуць. Яшчэ можа быць узведзена прыкладна 5 млн квадратных метраў. Новыя аб'екты пабудуюць у тым ліку за кошт зносу старога жылля і сядзібных участкаў.

«Трэба быць падрыхтаваным да таго, што калісьці наступіць мяжа будаўніцтва жылля ўнутры кальца. Трэба мець магчымасці і жаданне падрыхтавацца гарадам-спадарожнікам. Гарады-спадарожнікі павінны атрымаць неабходную інфраструктуру», — падкрэсліў Анатоль Чорны.

Міністэрства плануе ўвесці сёлета і новыя патрабаванні для камерцыйных забудоўшчыкаў. Яны будуць павінны здаваць кватэры з пэўным (хоць бы мінімальным) узроўнем аддзелачных работ.

«Мы не гонімся сёння за колькасцю квадратных метраў. Нам не патрэбна статыстыка, мы будзем будаваць колькі патрэбна, але жыллё павінна быць якаснае, зробленае паводле патрабаванняў нашай эканомікі», — сказаў Анатоль Чорны.

З ростам аб'ёмаў будаўніцтва, па словах міністра, адчуваецца і недахоп высокакваліфікаваных кадраў. Вырашаць праблему плануюць за кошт навучання новых спецыялістаў і прыцягнення рабочых, якія ў пошуках «доўгага рубля» з'язджаюць за мяжу.

**Марыя ДАДАЛКА**

# ВАСІЛЬКІ Ў ШАНХАІ

## Як папулярызуюцца беларускія брэнды ў Паднябеснай

**Кітай — другая эканоміка ў свеце, адзін з лідараў па імпарце тавараў. Прычым патрэбнасць у замежнай прадукцыі ў краіне з насельніцтвам каля 1,4 млрд пастаянна расце. Усё больш папулярнымі ў Паднябеснай становяцца беларускія тавары, асабліва мяса-малочная прадукцыя. Дзве краіны наладзілі стратэгічнае партнёрства, і нядзіўна, што Беларусь была запрошана для ўдзелу ў першай кітайскай міжнароднай выстаўцы імпартных тавараў і паслуг «Імпарт Экспа», якая пройдзе ў Шанхаі з 5 па 10 лістапада. Арганізатарам беларускай экспазіцыі выступае Нацыянальны цэнтр маркетынгу Міністэрства замежных спраў. Дырэктар цэнтра Валерый САДОХА расказаў карэспандэнту БелТА аб удзеле беларускіх прадпрыемстваў у выстаўцы і іншых спасобах пашырэння экспарту тавараў і паслуг у Кітай.**

***— На выстаўцы будзе прадстаўлена прадукцыя больш як 1600 кампаній з усяго свету. Чым здзівіць і прывабіць кітайскіх імпарцёраў беларускі павільён?***

— Наведвальнікі змогуць азнаёміцца з прамысловым, адукацыйным, транспартна-лагістычным, экспартным патэнцыялам нашай краіны. Будуць прэзентаваны апошнія навукова-тэхнічныя і інавацыйныя распрацоўкі, унікальныя турыстычныя магчымасці Беларусі. Плануецца таксама дэгустацыя харчовых тавараў.

Дызайн беларускага стэнда высока ацанілі кітайскія калегі ў рамках экспертнай сустрэчы, якая адбылася 11 ліпеня ў пасольстве Кітая ў Беларусі. Акрамя традыцыйнага лагатыпа Made in Belarus, пры распрацоўцы дызайну выкарыстоўваўся беларускі сімвал — кветка васілька, форма якой уяўляе сабой васьміканцовую зорку — сімвал сонца — і з'яўляецца элементам беларускага арнаменту. Гэты культурны код фарміруе нашу адметную рысу сярод мноства іншых народаў. Яшчэ трэба вызначыцца са слоганам, які адлюстроўвае дружалюбныя адносіны Беларусі і Кітая.

***— Для беларускіх прадпрыемстваў адвядуць каля 500 кв. м выставачных плошчаў. Колькі кампаній ужо заявілі аб удзеле?***

— У камерцыйным блоку выстаўкі будуць прадстаўлены амаль усе сферы беларускай эканомікі. Больш за 70 прадпрыемстваў экспануюць свае тавары і паслугі ў шасці павільёнах выстаўкі па наступных раздзелах: аўтамабілебудаванне, спажывецкія тавары, інтэлектуальнае і высокатэхналагічнае абсталяванне, гандаль паслугамі, медыцынскае абсталяванне, сельскагаспадарчая і харчовая прадукцыя. Апошні павільён з'яўляецца найбольш запатрабаваным, сваю прадукцыю ў ім прадставяць каля 40 беларускіх прадпрыемстваў мяса-малочнай галіны.

На ўдзел у выстаўцы прадугледжаны пэўныя затраты, але хіба можна ацаніць грашамі магчымасць заключэння выгадных кантрактаў, пачатку шматгадовага супрацоўніцтва? На «Імпарт Экспа» будуць прысутнічаць буйнейшыя імпарцёры з розных правінцый Кітая. Акрамя таго, нацыянальная экспазіцыя адлюстроўвае імідж краіны, яе эканамічны патэнцыял.

***— У якой беларускай прадукцыі, на ваш погляд, найбольш зацікаўлены Кітай?***

— Набіраюць папулярнасць беларуская прадукцыя з ялавічыны, малочныя прадукты, натуральны мёд. Акрамя таго, з'яўляецца мэтазгодным стварэнне на тэрыторыі Кітая сумесных вытворчасцей па зборцы сельскагаспадарчай тэхнікі, якая адпавядае спецыфіцы і патрэбам гэтага рынку. У цэлым яго спажывецкая здольнасць вышэйшая за вытворчую, таму высокім попытам карыстаецца якасная і канкурэнтаздольная прадукцыя з-за мяжы.

Тавараабарот Беларусі і Кітая ў студзені-красавіку склаў $1,09 млрд. Пры гэтым беларускі экспарт у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічыўся на 37,9 працэнта да $138 млн. Сярод экспартных пазіцый можна выдзеліць калійныя ўгнаенні ($100,9 млн), поліаміды ($13,8 млн), лён ($3,6 млн), малочную прадукцыю ($2,9 млн). У сваю чаргу Кітай паставіў тавараў на $949,8 млн. У асноўным гэта апаратура сувязі, камп'ютарная тэхніка, часткі і прылады для аўтамабіляў і трактароў.

Урадам пастаўлена задача дасягнуць да 2020 года ўзроўню экспарту ў Кітай у суме не менш як $1,5 млрд. Без адпаведнай дыверсіфікацыі экспарту будзе вельмі цяжка дасягнуць такога выніку.

***— Беларускі кантактны офіс для падтрымкі экспарту арганізаваны ў кітайскім горадзе Цындаа. Якія чаканні вы звязваеце з яго работай?***

— Хачу падкрэсліць, што магчымасць адкрыць сваё прадстаўніцтва ў гэтым кантактным офісе на вельмі выгадных, ільготных умовах ёсць у любога беларускага прадпрыемства, якое атрымала рэкамендацыі Нацыянальнага цэнтра маркетынгу. У прыватнасці, бясплатна прапануецца дапамога ў арганізацыі праз офіс аптовага гандлю беларускімі таварамі, а таксама арэнда складскіх памяшканняў і плошчаў для дэманстрацыі ўзораў тавараў. Беларускі кантактны офіс размешчаны ў інавацыйным цэнтры супрацоўніцтва з краінамі Пояса і Шляху (BRCIC). Тут ужо адкрыты нацыянальныя офісы пасольстваў краін Азіі і Афрыкі. Беларускі офіс толькі пачынае сваю работу. Чакаецца, што ён будзе садзейнічаць інтэнсіфікацыі беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў сферах гандлю, фінансаў, культуры, спорту, турызму, адукацыі, а таксама дасць магчымасць павялічыць экспарт беларускіх прадпрыемстваў у Кітай.

***— Ці плануецца стварэнне такіх структур у іншых краінах?***

— Спачатку паглядзім, як будзе рэалізаваны кітайскі праект, наколькі запатрабаваным ён будзе сярод беларускіх прадпрыемстваў-экспарцёраў.

***— Як яшчэ Нацыянальны цэнтр маркетынгу дапамагае беларускім экспарцёрам пры выхадзе на кітайскі рынак?***

— Акрамя арганізацыі выставачных мерапрыемстваў за мяжой, у тым ліку ў Кітаі, мы праводзім маркетынгавыя даследаванні, займаемся пошукам імпарцёраў, дылераў і дзелавых партнёраў за мяжой. У нашай кампетэнцыі таксама арганізацыя і правядзенне сустрэч і перагавораў у фармаце B2B, міжнародных форумаў, анлайн-відэаканферэнцый з удзелам замежных экспертаў і дыпламатаў пасольстваў Беларусі за мяжой.

Акрамя таго, цэнтр выступае аператарам партала Export.by, які з'яўляецца асноўным інструментам дэманстрацыі экспартных магчымасцей беларускіх прадпрыемстваў і імпразіваванай віртуальнай беларускіх тавараў, якія можна пры дапамозе партала ўбачыць у любой краіне свету. Яны сапраўды канкурэнтаздольныя па многіх пазіцыях, прадпрыемствам важна ўмець заявіць пра сябе, у тым ліку на маштабных выстаўках. Наперадзе ўдзел у важнейшым праекце, чакаем заключэння шматлікіх кантрактаў.

■ Міжнародныя сувязі

# ПРЫМОРСКІ БРЫЗ КІТАЯ

## Гродзенцы наладжваюць стасункі з правінцыяй Фуцзянь

**Прадстаўнічая дэлегацыя з Кітая наведала Гродна, дзе адбылося падпісанне двухбаковага пратакола аб намерах па ўсталяванні сяброўскіх адносін паміж Гродзеншчынай і марской правінцыяй Фуцзянь. Гэта другая кітайская правінцыя, з якой у гродзенцаў наладжваюцца сувязі. Рэгіён ужо трывала супрацоўнічае з правінцыяй Ганьсу, у вобласці рэалізуецца некалькі значных інвестпраектаў. У новых партнёраў таксама нямала планаў у розных сферах.**



Госці з Кітая зацікаўлены ў гандлёвых адносінах, а таксама ў гуманітарных сувязях. Лян Цзяньюн, кіраўнік дэлегацыі, начальнік аддзела прапаганды парткома КПК правінцыі Фуцзянь, выказаў інтарэс да прадукцыі сельскай гаспадаркі, у прыватнасці гродзенскай «малочкі», якая ўжо сертыфікавана для паставак у КНР. У цяперашні час вядзецца сертыфікацыя мясной прадукцыі рэгіёна. Кіраўнік дэлегацыі запэўніў, што пошук інвестараў для сумесных праектаў, у тым ліку ў сферы энергетыкі, будзе наладжаны. Прадстаўнікі правінцыі Фуцзянь расказалі, што тут развіты электроніка, машынабудаванне, лёгкая прамысловасць. У ёй знаходзіцца і самы вялікі завод па вытворчасці акумулятараў у свеце.

> ❍ Наша даведка:
>
> ***Правінцыя Фуцзянь знаходзіцца на марскім узбярэжжы паўднёва-ўсходняга Кітая. Горы і ўзвышшы займаюць каля 90 % плошчы. Насельніцтва складае каля 40 мільёнаў чалавек.***

Абодва бакі зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва турыстычнай сферы. Імпульс надасць 30-дзённы бязвізавы рэжым, які ў хуткім часе пачне дзейнічаць паміж дзвюма краінамі. Да таго ж 2018 год аб'яўлены ў Кітаі годам турызму Рэспублікі Беларусь. Адносіны паміж краінамі садзейнічаць развіццю рэгіянальных сувязяў у гэтай сферы, адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў. Так, у Гродне на турыстычных аб'ектах можна атрымаць інфармацыю на кітайскай мове. Гродзенцы прымаюць удзел у кітайскіх выстаўках.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

## ■ Май на ўвазе!

# СЭКАНОМІЦЬ НА ВАДЗЕ

### Мінжылкамгас прапануе ўстанаўліваць асобныя лічыльнікі вады на паліўку агарода і ўтрыманне жывёлы

«Жыхарам прыватнага сектара прапануецца ўстанаўліваць дадатковыя прыборы ўліку вады для паліўкі агарода і ўтрымання жывёлы. З 1 ліпеня пачала дзейнічаць норма пастановы Савета Міністраў № 510, згодна з якой пры наяўнасці такіх прыбораў змяняецца механізм налічэння платы за водаадвядзенне (каналізацыю) — з сумарнага аб'ёму спажытай вады выключаецца аб'ём, зрасходаваны на паліўку агарода і ўтрыманне жывёлы», — паведаміла карэспандэнту БЕЛТА **начальнік упраўлення эканомікі Мінжылкамгаса Наталля ЛІТВІНЧУК.**

Плата за водаадвядзенне налічваецца суразмерна спажытым аб'ёмам вады (у Мінску тарыф на паслугу каналізацыі складае Br0,5398 за 1 куб. м). У той жа час пры паліўцы агарода дадатковай нагрузкі на каналізацыйныя сеткі няма. «Разлікі па паказаннях дадатковых лічыльнікаў даюць магчымасць сэканоміць. Для іх устаноўкі неабходна звярнуцца ў абслуговую арганізацыю водна-каналізацыйнай гаспадаркі для атрымання тэхумоў і ўзгаднення месца ўстаноўкі. Устанавіць індывідуальны прыбор уліку можа любая арганізацыя, якая аказвае гэты від паслуг і мае адпаведны сертыфікат. Затраты на куплю і ўстаноўку гэтых прыбораў нясе спажывец», — растлумачыла начальнік упраўлення эканомікі.

Для налічэння платы за водазабеспячэнне па-ранейшаму будзе ўлічвацца ўвесь аб'ём спажытай вады, згодна з паказаннямі ўсіх устаноўленых лічыльнікаў — халоднай, гарачай вады, для паліўкі агарода і ўтрымання жывёлы. Норма спажывання вады для аплаты па субсідзіруемым тарыфе складае 140 л у суткі на чалавека. Пры перавышэнні гэтай нормы плата налічваецца па эканамічна абгрунтаваным тарыфе. У Мінску субсідзіруемы тарыф на паслугу водазабеспячэння складае Br0,8053 за 1 куб. м, эканамічна абгрунтаваны — Br0,8114 за 1 куб. м ■

## ■ Грошы

# Валютныя запасы папаўняюцца

### Грамадзяне ў студзені — ліпені прадалі валюты больш, чым купілі

Як паведамляецца на афіцыйным сайце Нацыянальнага банка, з пачатку года насельніцтва прадало наяўнай і безнаяўнай валюты на $5,287 млрд у эквіваленце, купіла $4,364 млрд. Чысты продаж замежнай валюты фізічнымі асобамі склаў $923 млн.

А вось суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі ў студзені — ліпені прадалі замежнай валюты на $11,493 млрд у эквіваленце, купілі $11,727 млрд.

У той жа час нерэзідэнты Беларусі за сем месяцаў прадалі валюты на $343,7 млн у эквіваленце, набылі — $60,5 млн.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**


**Антикризисный управляющий Правовая компания «БелПрофКонсалт» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**

1. ООО «Хатрик» (дата торгов: 10.09.2018 в 11.00).

Имущество, реализуемое на торгах:

Лот № 1. Нитки, нач. цена торгов – 30 727,24 бел. руб. (с НДС).

Лот № 2. Иная швейная фурнитура, нач. цена торгов 28 671,19 бел. руб. (с НДС).

Лот № 3. Ленты, нач. цена торгов – 8037,77 бел. руб. (с НДС).

Лот № 4. Молнии, нач. цена торгов – 14 588,98 бел. руб. (с НДС).

Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 127, оф. 312.

2. ООО «Викди-М» (дата торгов: 16.08.2018 в 15.00).

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещены в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by

УНП 191875692

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «МОСТОВДРЕВ»**

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот № 1** | | |
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Капитальное строение с инв. № 412/С-10330** (жилой дом) общей площадью 146,0 кв. м, кирпичное, 2 этажа, 2001 г. п. Составные части и принадлежности: гараж, подвал, две террасы, сарай, забор, калитка, ворота, мощение | | |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 424050100009000120, площадь 0,1144 га, назначение – для размещения объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | | |
| Местонахождение имущества: Гродненская обл., Мостовский р-н, г. Мосты, ул. 40 лет БССР, д. 17 | | | |
| Начальная цена | **96 200 рублей без учета НДС** | Задаток (5 %) | **4 810 рублей** |
| Сведения о продавце | ОАО «Мостовдрев», Гродненская обл., г. Мосты, ул. Советская, 38, тел. 8 (01515) 3 36 63 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, номер счета BY65-BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906 | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 5 рабочих дней с даты подписания протокола о проведении торгов | Условия оплаты | определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 10 сентября 2018 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов | **По 4 сентября 2018 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| **Дополнительная информация по телефонам в г. Гродно: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79** | | | |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Извещение о проведении повторного аукциона** | | | |
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОАО «Белсантехмонтаж-2», г. Минск, ул. Брилевская, 15 | | |
| **Предмет аукциона Имущество, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Промышленный, 12, в составе** | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общ. пл.** | **Инв. номер** |
| **Навес-склад (литер В 1/кп)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 3433 кв. м | 500/С-29825 |
| **Цех изоляции труб и открытая площадка № 1, № 2 (литер Е 1/кп)** | Здание неустановленного назначения | 1147 кв. м | 500/С-31742 |
| **Д 1/к. Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 380 кв. м | 500/С-29823 |
| **Насосная станция. Литер Ж 1/к** | Здание неустановленного назначения (составные части и принадлежности: два подземных резервуара) | 51 кв. м | 500/С-31729 |
| **Здание административно-хозяйственное** | Здание административно-хозяйственное | 4343,8 кв. м | 500/С-29809 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 52,3 кв. м | 500/С-31254 |
| **Пост сварки** | Здание специализированное для производства строительных материалов | 26,9 кв. м | 500/С-35219 |
| **Внутренние сети связи** | Сооружение специализированное связи | 96,7 кв. м | 500/С-1025198 |
| **Хозяйственно-бытовая канализационная сеть** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 261,8 кв. м | 500/С-1025197 |
| **Ливневая канализационная сеть** | | 1170,7 кв. м | 500/С-1025196 |
| **Сведения о земельном участке** | Общ. пл. 4,6795 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания административно-бытового, производственных и складских зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения, пл. 0,2250 га; в охранных зонах линий связи и радиофикации, пл. 0,0210 га; обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, пл. 4,8772 га | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **1 992 336,00 белорусского рубля (снижена на 60 %)** | | |
| **Обременения** | Аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390 | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| Предыдущее извещение о проведения аукциона опубликовано в газете «Звязда» в номере от 06.07.2018 | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **22.08.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **20.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | |

**Извещение о проведении 10 сентября 2018 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»**

| **Предмет торгов** |
|---|
| Нежилой сборный домик общей площадью 54,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-109697; повышенный железнодорожный путь протяженностью 240 м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-146178; сооружение артезианской скважины, инв. № в ЕГРНИ 600/С-102835; цементный склад, инв. № в ЕГРНИ 600/С-102840 (составные части и принадлежности: цементный склад с навесом цементного склада с пристройкой а1, навесом цементного склада с шиферной крышей а2, ограждением а3); цементобетонная площадка общей площадью 1303 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-102842 (составные части и принадлежности: цементобетонная площадка с бетонной площадкой а1, ограждением а2); воздухосборник В-10 МЗ (инв. № 41077); воздухосборник В-10 МЗ (инв. № 41078); лебедка ТЛ 8Б (инв. № 40769); пневмоподъемник ППВ-100 (инв. № 50616); пневмоподъемник ППВ-100 (инв. № 50615); пневмоподъемник ТА 15А (инв. № 50199) |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, д. 1 |
| Сведения о земельных участках: площадь – 0,6577 га, кадастровый номер – 623650100001004285; площадь – 0,0984 га, кадастровый номер – 623650100001004286; площадь – 1,0226 га, кадастровый номер – 623650100001004287; площадь – 0,0024 га, кадастровый номер – 623650100001004546 |
| Начальная цена: 704 207,39 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 70 000,00 бел. руб. |
| Обременения: аренда, сервитут |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условия торгов:**

1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

2. Сохранение победителем торгов (покупателем) сервитута при переходе прав на недвижимое имущество.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 10 сентября 2018 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 09.08.2018 по 06.09.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 507-61-83 (ОАО «ДСТ № 7»)

**ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 24.08.2018 г. повторные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества ЧПУП «Молочно-товарная«Сырмеж» (продавец)**

Сведения о предмете электронных торгов: капитальное строение (здание одноквартирного жилого дома), общая площадь застройки – 72,7 кв. м, строительный объем – 244 куб. м, год постройки – 2010, пристройка – строительный объем – 31 куб. м, сарай – строительный объем – 94 куб. м, расположенное на земельном участке с кадастровым № 624081406801000039 (площадь 0,1428 га).

Дата проведения электронных торгов: 24.08.2018 года.

Место нахождения предметов электронных торгов: Минская область, Мядельский р-н, Занарочский с/с, аг. Сырмеж, д. 56.

Начальная цена предмета электронных торгов: 7 000 руб. 00 коп., без НДС.

Шаг аукциона: 5 % – 350 руб. 00 коп.

Сумма задатка: 10 % – 700 руб. 00 коп.

Срок экспозиции: 15 календарных дней.

Сумма затрат Поверенного по организации и проведению электронных торгов: 60 руб. 00 коп.

Расчетный счет для перечисления суммы задатка: р/с (IBAN): BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код. (BIC): UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793.

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги ) будут проведены 24.08.2018 г. в 9.00 , на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 24.08.2018 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел. (8 029) 982-65-56 , WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лотам: продавец ЧПУП «Молочно-товарная«Сырмеж» в лице управляющего по банкротству ООО «Лигал Консалт», директор Савченко Екатерина Александровна, тел. (8 029) 5691972. Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг», – WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по каждому лоту принимаются по 21.08.2018 г.

# ШЧАСЦЕ НАВУЧАЦЬ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## СУПАСТАЎЦЕ МАГЧЫМАСЦІ З ЧАКАННЯМІ

Арганізатары майстэрні прызнаюцца: моцна здзівіліся, калі ўбачылі, што на мерапрыемства для маладых настаўнікаў з мінімальным або ўвогуле нулявым вопытам работы зарэгістравалася шмат вопытных педагогаў, чый прафесійны стаж вагаўся ад 7 да 25 гадоў. Здзівіліся і разгубіліся... Што рабіць, каб было цікава і, галоўнае, карысна ўсім? Таму трансфармавалі сустрэчу ў інтэрактыўны фармат, каб маладыя настаўнікі змаглі знайсці адказы на важныя пытанні, якія іх хвалююць, а сталыя педагогі — падзяліцца часцінкай каштоўнага вопыту, прыгадаўшы тыя часы, калі яны самі толькі пачыналі свой прафесійны шлях.

Цікава, а чаго яны калісьці баяліся? І ці моцна адрозніваюцца іх страхі ад страхаў маладых? Першыя прызнаюцца, што баяліся аказацца з дзецьмі на розных хвалях, што вучні не будуць успрымаць іх усур'ёз, баяліся неадэкватных кіраўнікоў і негатыўнага стаўлення да іх старшых калег.

**«Важна ўстанавіць паміж настаўнікам і вучнямі правільную дыстанцыю. Напрыклад, прапішыце, што настаўніка нельга запрашаць на спатканне...»**

Маладыя ўсур'ёз апасаюцца ціску на іх з боку бацькоў вучняў, баяцца страціць аўтарытэт, перайсці мяжу «настаўнік — сябар», не знайсці падыход да «асаблівых дзяцей», прымусіць вучняў думаць шаблонна, зламаць іх, укласці ў іх свае думкі, не дасягнуць адукацыйнай мэты, не знайсці падтрымкі і разумення з боку калег, апасаюцца аказацца некваліфікаванымі, а таксама завышаных патрабаванняў з боку адміністрацыі.

— Ва ўніверсітэце закладваецца фундамент, але будаваць дом на гэтым фундаменце даводзіцца ўжо самастойна, — папярэджвае Анастасія. — **Першы важны этап — гутарка з кіраўніком установы адукацыі.** Паверце, што знешні выгляд мае значэнне, таму падумайце, якое ўражанне вы хацелі б пакінуць. Падчас гутаркі не толькі вам будуць задаваць пытанні, але і вы таксама павінны іх задаваць. Напрыклад, якая будзе ваша вучэбная нагрузка, бо ад яе наўпрост залежыць заробак. Для маладых спецыялістаў, якія былі размеркаваныя, абавязаны выдзеліць не менш за 20 гадзін у тыдзень. Карэктна ўдакладніце, які заробак гэтаму адпавядае, каб не адчуць лёгкі шок ад першай зарплаты. Спытайцеся, у якіх класах вы будзеце выкладаць, ці будзе ў вас класнае кіраўніцтва? Абавязкова пацікаўцеся, якія надзеі ўскладае на вас кіраўнік, што ён ад вас чакае, акрамя правядзення ўрокаў? Можа быць, ён хоча, каб вы арганізавалі тэатральны гурток, а, можа быць, хацеў бы, каб вы рыхтавалі дзяцей да алімпіяды? Так вы зможаце супаставіць свае магчымасці з чаканнямі кіраўніцтва...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ПЛАН — ВАША «ШПАРГАЛКА» НА КОЖНЫ ЎРОК

**Асобная тэма — нарматыўна-прававая дакументацыя і запаўненне папер.** Паводле пастановы Міністэрства адукацыі, спіс дакументацыі, якую павінны запаўняць настаўнікі, абмежаваны чатырма пунктамі: класным журналам, каляндарна-тэматычным планаваннем, паўрочным планаваннем і дзённікамі навучэнцаў.

— Каляндарна-тэматычнае планаванне можна знайсці на партале Нацыянальнага інстытута адукацыі (www.adu.by). Яго можна адаптаваць пад сябе, але пажадана ў першыя два-тры гады гэтага не рабіць, таму што малады педагог наўрад ці разумее, на якіх тэмах можна скараціць колькасць гадзін, а дзе, наадварот, гадзін не хапае. Таму лепш давярэцеся Нацыянальнаму інстытуту адукацыі і выкарыстоўвайце іх планаванне, — раіць настаўніца. — А вось што датычыцца плана-канспекта ўрока, то ён у вас абавязкова павінен быць або ў рукапісным, або ў раздрукаваным варыянце. Заявіць, што мой план урока знаходзіцца на дамашнім камп'ютары, вы не зможаце...

Калі мы выстаўляем вучню адзнаку ў журнал, абавязкова трэба выставіць яе і ў дзённік, бо здараецца, што бацькі прыходзяць і кажуць: «У майго дзіцяці за чвэрць «пяцёрка», а я не бачыла ў яго дзённіку ніводнай адзнакі за некалькі месяцаў...» Зусім не залішнім будзе і азнаямленне з нарматыўна-прававымі дакументамі: іх веданне дапаможа абараніць вас у спрэчках як з бацькамі, так і з адміністрацыяй, дапаможа аргументаваць сваю пазіцыю.

Амерыканскі педагог Адам Дрэер класіфікаваў **тыповыя памылкі настаўнікаў-пачаткоўцаў. І першая з іх — недастатковая падрыхтоўка.** Як ужо казалася вышэй, у педагога абавязкова павінен быць план-канспект урока. Кожны яго элемент трэба прадумваць, прычым матэрыялу, што выкладзены ў падручніку, настаўніку недастаткова. «Я сама сутыкалася з тым, што навучэнцы пачынаюць нас правяраць на трываласць, спрабуюць «празандзіраваць» наш кругагляд, наколькі добра настаўнік валодае той ці іншай тэмай», — усміхаецца Анастасія.

## СТУКАЙЦЕ, І ВАМ АДЧЫНЯЦЬ!

Яшчэ адна памылка — **шматслоўе педагога.** Маладыя настаўнікі нярэдка атрымліваюць такую асалоду ад сваёй новай ролі, што могуць размаўляць усе 45 хвілін без супынку. Пры пераходзе ад старой мадэлі педагогікі да новай актыўная роля перадаецца вучням. А настаўнік павінен іх накіроўваць, натхняць і падтрымліваць. **Сур'ёзны прабел у рабоце — адсутнасць рэфлексіі.** Без зваротнай сувязі немагчыма зразумець, наколькі былі цікавыя метады і прыёмы, якімі вы карысталіся на ўроку? Ці дасягнулі вы сваёй мэты?

Моцна перашкаджае настаўніку адбыцца і яго нетаварыскасць. «Я цэлы год не выходзіла са свайго кабінета, ні з кім не кантактавала, і мае калегі падумалі, што са мной штосьці не так, бо дзіўна, калі малады настаўнік ні пра што не пытаецца. Няўжо ён усё ведае? Насамрэч у мяне было мноства пытанняў, але ж я, магістр педагагічных навук, баялася паказацца некампетэнтнай, таму сядзела і псавала класны журнал. Замест таго, каб спытаць і вырашыць праблему за тры хвіліны, гадзінамі чытала інструкцыю па запаўненні журнала і ўсё роўна дапускала памылкі, — смяецца Анастасія. — З калегамі трэба абавязкова падтрымліваць стасункі: калі ты будзеш адкрыты да людзей, то ўсё пачне ў цябе атрымлівацца. Самае галоўнае — не забывайце, што дзверы не адчыняцца, пакуль вы ў іх не пастукаеце...»

## РАССТАЎЛЯЙЦЕ ПРЫЯРЫТЭТЫ

— Адна з самых распаўсюджаных памылак — **работа па начах.** «У гэтым я вялікі спецыяліст, — канстатуе настаўніца. — Дэфіцыт часу ты спрабуеш кампенсаваць, але хутка пераконваешся, што эфект ад такой працы нулявы. Ноччу трэба спаць, а вось дзень трэба планаваць дасканала.

У гэтым дапаможа **тайм-менеджмент — мастацтва кіраваць сваім часам.** Перад педагогам стаіць вельмі шмат задач, і з кожным днём іх становіцца ўсё больш. На перапынках пастаянна забягаюць калегі, прадстаўнікі адміністрацыі, штосьці просяць зрабіць... Не хапайцеся адразу за ўсе задачы, якія будуць на вас сыпацца (вы ніколі з усімі не справіцеся)... Ацаніце ступень іх тэрміновасці. Можна вечарам занатаваць спіс усіх задач, каб дакладна разумець, з якімі аб'ёмамі работы давядзецца спраўляцца заўтра. Далей трэба расставіць прыярытэты: у першую чаргу выконваць задачы з паметкай «дэдлайн», далей можна сканцэнтравацца на стратэгічных задачах, якія могуць прасунуць нас у прафесійным развіцці. Напрыклад, я хачу прачытаць артыкул пра перакуленае навучанне — гэта мая стратэгічная задача. Не перажывайце, што вам не ўдасца зрабіць усё. Праца настаўніка вылучаецца тым, што зрабіць усю работу проста немагчыма...

**❍ Будзь у курсе!**

***Педагагічныя майстэрні — бясплатныя мерапрыемствы для настаўнікаў. Наведаць іх могуць усе ахвотныя. Даведацца пра тэму чарговай майстэрні можна ў «Фэйсбуку» ў групе «Суполка настаўнікаў Беларусі».***

Згодна з амерыканскімі даследаваннямі, для эфектыўнай работы трэба ўвогуле прыбраць тэлефон са стала. Калі ён ляжыць побач, нават адключаны, мы ўсё роўна трацім сваю энергію на тое, каб на яго не глядзець, нават калі і не прызнаёмся сабе ў гэтым. Таму, каб мозг спакойна працаваў над нейкай задачай, тэлефона ў полі зроку не павінна быць!

Настаўніку вельмі шмат тэлефануюць. Абавязкова пазначайце ў штодзённіку вынікі вашай размовы. Паверце, што праз дзве гадзіны, вы не будзеце памятаць і палову з таго, пра што вам казалі бацькі вучня... А калі вы самі тэлефануеце, абавязкова напішыце мэту званка, каб размова насамрэч была накіравана на вырашэнне канкрэтнага пытання.

## ВЫЗНАЧЫЦЕ «ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ»

Анастасія падкрэслівае: час для стасункаў з бацькамі трэба ўстанавіць яшчэ пры першай сустрэчы. Яны павінны разумець, што настаўнік таксама мае права на адпачынак і ў яго павінна быць уласная тэрыторыя. Інакш вам будуць тэлефанаваць і ў адзінаццаць гадзін вечара... Можна, канешне, прапанаваць альтэрнатыўны спосаб, напрыклад, стварыць групу класа ў «Вайберы», але, шчыра кажучы, гэта не вельмі ўдалы выхад, бо ў такім разе вы будзеце знаходзіцца ў кругласутачным доступе...

Трэба адразу вызначыць стыль стасункаў з навучэнцамі. Якім педагогам вы жадаеце быць: аўтарытарным або ліберальным? Якая роля для вас найбольш камфортная? Самае лепшае — вызначыць разам з вучнямі агульныя правілы існавання: што можна і што нельга рабіць на ўроку? Напрыклад, ці можа знаходзіцца на стале мабільны тэлефон? А калі можа, то для якіх мэт? Правілы, якія прымаюцца сумесна, дзеці выконваюць са значна большай ахвотай, чым навязаныя ім зверху, і нават самі адсочваюць іх захаванне. Важна ўстанавіць паміж настаўнікам і вучнямі правільную дыстанцыю. Напрыклад, прапішыце, што настаўніка нельга запрашаць на спатканне... Для маладых педагогаў, у якіх зусім невялікая розніца ва ўзросце са старшакласнікамі, гэта можа быць актуальным.

**«Праца настаўніка вылучаецца тым, што зрабіць усю работу проста немагчыма...»**

«Аднойчы вучань паклікаў мяне на спатканне, — прызнаецца Анастасія. — Вядома, я перавяла ўсё ў жарт, але для сябе адзначыла, што заўсёды трэба быць напагатове. Настаўнік для вучняў — гэта мадэль для пераймання. Дзеці ацэньваюць, што і як мы кажам, у чым прыходзім у школу. Ніхто не кажа пра дарагія ўборы, але трэба быць цікавым вучням ва ўсім, у тым ліку звяртаць увагу і на свой знешні выгляд. Калі мы з павагай ставімся да дзяцей, то гэта мадэль паводзінаў добра пераймаецца вучнямі. Да дзеясловаў «пайдзі», «прынясі», «зрабі» як мінімум трэба дадаваць слова «калі ласка»... Сказаць ім проста «трэба» будзе недастаткова, неабходна іх зацікавіць ці пераканаць... І абавязкова хваліце вучняў!»

Канфлікты з бацькамі здараюцца ва ўсіх без выключэння настаўнікаў, не толькі ў маладых. А здольнасць іх вырашаць, знаходзіць агульную мову, прыходзіць толькі з вопытам работы. Заўсёды ёсць бацькі, якія лёгка ідуць на кантакт, давяраюць, падтрымліваюць і гатовыя дапамагчы, калі ты пра штосьці папросіш. На іх і варта абапірацца ў першую чаргу. Сумесны адпачынак вучняў, настаўніка і бацькоў будзе вельмі карысны. Падчас такіх мерапрыемстваў наладжваюцца сувязі, устанаўліваюцца кантакты, педагог і бацькі пачынаюць лепш разумець і чуць адзін аднаго.

Анастасія ўпэўнена, што да школы нельга ставіцца проста як да месца працы. Ад стасункаў з дзецьмі і калегамі трэба атрымліваць задавальненне. «Радуйцеся поспехам, але памятайце, што пражыць без памылак і няўдач немагчыма, — кажа яна. — Захоўвайце пачуццё гумару, будзьце самі сабой. **І ні ў якім разе не далучайцеся да калег, якія вельмі шмат скардзяцца: гэта «заразна» не менш, чым вірус грыпу. Лепш шукайце тое, што вас можа натхніць, свой маяк у прафесіі.** Для мяне сапраўднай крыніцай натхнення стала інтэрактыўнае, перакуленае навучанне. Насамрэч вучыць дзяцей — гэта шчасце. І за маладымі настаўнікамі — будучыня...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Спрэчны момант

# ТУРЫСТ ПАКЛАПОЦІЦЦА ПРА СЯБЕ САМ?

**Гэтым летам турыстычная фірма «Наталі Турс» адклікала ўжо аформленыя туры на адпачынак. Як вынік — мара пра сонечны пляж абярнулася для тысяч людзей грашовымі стратамі і сапсаваным настроем. Акрамя таго, частка турыстаў засталася «на чамаданах» у замежжы.**

**Такі выпадак у турыстычнай сферы, як заўважыў дырэктар Рэспубліканскага саюза турыстычных арганізацый Валянцін ЦЭХМЕЙСТЭР, не новы. Праблемы з тураператарамі ўзнікалі ў 2014 годзе, калі «палеглі» дзясяткі расійскіх кампаній, але той крызіс не зачапіў настолькі масава беларускіх спажыўцоў. Пытанне «Як развіваць турыстычны бізнес у нашай краіне?» стала важным як ніколі. На круглым стале, прысвечаным менавіта гэтай праблеме, спецыялісты з розных галін спрабавалі высветліць, як абараніць турыста ад невыканання тураператарам сваіх абавязкаў, што патрэбна, каб турыстычныя агенты не станавіліся ва ўсім вінаватымі і як не «падарваць» беларускі турыстычны рынак, захаваўшы ў грамадзяніна давер да прадаўцоў турыстычных паслуг.**



— Сёння якраз наспеў момант для аб'яднання з дзяржаўнымі органамі, каб вырашыць нарэшце спрэчныя моманты ў турыстычнай сферы, — лічыць Валянцін Цэхмейстэр. — Прадстаўнікі турызму бачаць некалькі варыянтаў, як палепшыць якасць і бяспеку паслуг. І першая мера — гэта ўнясенне комплексных паправак у заканадаўства. Канешне, гэта доўгі працэс, які можа заняць ад трох да пяці гадоў, перш чым сістэма запрацуе, але падобныя змены сталі неабходнымі. Я мяркую, трэба стварыць дзейную рабочую групу пры Міністэрстве спорту і турызму, удзельнікамі якой стануць прафесіяналы ад турбізнесу.

Ідэю з распрацоўкай заканадаўчых нормаў і стварэннем рабочых груп падтрымлівае **Філіп ГУЛЫ, старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі:**

— Прыклад «Наталі Турс» дастаткова значны і дастаткова яркі, каб прадэманстраваць слабасці нашага маленькага, ёмістага, неабароненага рынку. Не факт, што гэта апошняе хваляванне сёлетняга сезона. На жаль, існуюць пэўныя заканадаўчыя прабелы, якія не абараняюць беларускага турыста і айчыннага турагента ад дзеянасці замежных турыстычных аператараў. Акурат цяпер у людзей існуюць значныя фінансавыя праблемы, якія ўзніклі з-за адмовы фірмаў выконваць свае абавязкі, і трэба ўсімі сіламі пазбегнуць сёлетняй сітуацыі ў наступным сезоне адпачынкаў. Іначай беларускія кампаніі рызыкуюць зусім страціць давер у кліентаў. У спакойных, распланаваных вандроўках зацікаўлены ўсе: турысты, бізнесмены, чыноўнікі, — падкрэсліў Філіп Гулы.

Каб выпрацаваць свой шлях, беларусам не трэба «ісці навобмацак». Філіп Гулы прапанаваў скарыстацца вопытам суседніх краін. У Расіі, Польшчы, Украіне, Латвіі і Еўрапейскім саюзе таксама вырашалі турыстычнае пытанне, і прыкладаў — як станоўчых, так і негатыўных — дастаткова. Кіраўнік праўлення прапанаваў канкрэтныя інструменты для паляпшэння сітуацыі:

— На маю думку, патрэбны фінансавыя гарантыі з боку тураператараў. Нічога страшнага няма ў тым, што бізнес павінен замарозіць нейкую суму, каб мець «грашовую падушку» на ўсялякі выпадак.

**Генеральны дырэктар турыстычнай кампаніі «Топ-Тур» Сяргей ЦУРКО** прапануе паглядзець на сітуацыю пад крыху іншым вуглом.

— Хачу зрабіць акцэнт: праблемы і аферыраваныя структуры былі выяўлены ў нерэзідэнтаў, гэта значыць замежных кампаній, якія дзейнічалі на нашай тэрыторыі. Вядома, што некаторыя чыноўнікі ўжо прапанавалі сфарміраваць гарантыйныя фонды, якія будуць падтрымлівацца за кошт бюджэту турыстычных кампаній. Лічу, што такая мера поўнасцю нядзейсная. Чаму? Таму што ў Расіі і іншых краінах аналагічная сістэма не вырашыла ні адзін падобны інцыдэнт. Грошай усё роўна не хапае. Затое забаронныя меры разам з даступнасцю фінансавых сродкаў могуць стварыць глебу для карупцыйных схем.

На мой погляд, будзе эфектыўна ўвесці пункт абавязковага страхавання фінансавых рызык турыста. Так атрымалася, што людзі ахвотней выступаюць у ролі спажыўцоў, якія добра ведаюць свае правы, але стараюцца не думаць пра абавязкі, як і пра «падстрахоўку» ад надзвычайных здарэнняў. Яскравы прыклад: чалавек адмаўляецца ад медыцынскай страхоўкі, ці то разлічваючы на прынцып «а раптам пранясе», ці то свядома спадзеючыся, што турыстычная кампанія ў выпадку чаго пакрые выдаткі. Таму лічу, што, застрахаваўшыся асабіста на час паездкі, кожны турыст абароніць сябе ад непрыемнасцяў.

У спецыялістаў ад страхавання сваё меркаванне наконт гэтага. **Людміла КУЛАК, начальнік упраўлення медыцынскага страхавання страхавой кампаніі «Белдзяржстрах»** на прыкладах растлумачыла, чаму стварэнне турыстычнага фонду за кошт адпачывальнікаў можа стаць непапулярным рашэннем:

— Сёння заканадаўства не дае магчымасці заключаць дагавор страхавання ў адносінах да рызыкі невыканання дагавора з боку тураператара. Каб увесці механізм грамадзянскай адказнасці для тураператара, патрэбна адпаведная заканадаўчая прывязка. Сёння ўсе віды абавязковага страхавання датычацца толькі суб'ектаў гаспадарання. Калі ўводзіць абавязковую страхоўку для кожнага з грамадзян, такая мера прывядзе да сацыяльнага напружання і незадаволенасці.

Па словах Людмілы Кулак, сярод турыстаў становіцца папулярнай паслуга страхавання ад рызыкі адмены паездкі і рызыкі датэрміновага вяртання з адпачынку па ўважлівых прычынах. Можна разлічваць на вяртанне грошай, калі адпачынак не адбыўся па ўважлівай прычыне: з-за хваробы, тэхнагеннай аварыі, страты дакументаў... Кошт падобнай паслугі каля 5-8 еўра на чалавека. Вось толькі трэба разумець, што сума страхавання, а, адпаведна, і страхавога ўзносу, ад невыканання абавязацельстваў з боку тураператара будзе большай, таму што там улічваецца кошт усяго тура. А як паказвае вопыт, значная частка турыстаў нават неабходныя для выезду за мяжу страхавыя полісы стараецца набыць па мінімальным кошце. І розніца ў адзін еўра — дастатковая прычына для некаторых адмовіцца ад страхоўкі. Таму ідэя «добраахвотнай» выплаты з боку турыста сумы ў 10—50 еўра выклікае сумненні.

У час вырашэння спрэчных момантаў паміж турыстам і тураператарам не трэба забывацца на «трэці бок». Для турыстычнага агента нечаканая адмена тураў можа стаць фатальнай. **Дырэктар турыстычнага агенцтва «А» Алена КУДЛАКОВА** ў пытаннях страхоўкі трымаецца вельмі простай пазіцыі: галоўнае, каб страхавы поліс быў.

— Гатовых рашэнняў, як узмацняць сферу турыстычных паслуг, няма, таму спадзяюся, у хуткім часе іх выпрацуюць калегіяльна на сустрэчы рабочай групы.

Алена Кудлакова заўважае, што не назвала б беларускіх турыстаў безадказнымі. Грамадзяне ўсё ж такі ўсведамляюць рызыку, хаця існуюць асобныя выпадкі «турыстычнай безадказнасці».

Аднак самы вялікі «боль» турыстычнага агента звязаны з размежаваннем адказнасці паміж турагентам і тураператарам. Сёння агенты — гэта пасярэднікі паміж прадаўцом і кліентам, яны не могуць паўплываць на рашэнні тураператара, але традыцыйна выслухваюць скаргі і прэтэнзіі ад турыстаў у выпадку любых праблем з адпачынкам. Пры гэтым агенцтва часта не ў стане выплаціць кампенсацыю пакрыўджанаму турысту. У сітуацыі з адмовай ад выканання абавязкаў аператарам буйная арганізацыя яшчэ здолее перабраніраваць туры. Але маленькая кампанія фізічна не зможа ні прапанаваць альтэрнатыўную паслугу, ні выплаціць кампенсацыю і ў выніку абанкруціцца.

— Сёння, калі мы гаворым пра беларускіх тураператараў, то маем на ўвазе фірмы, у якіх ёсць турагенцкая сетка, — удакладняе **дырэктар тураператара «Дзітрыб» Ігар ЧОРНАЗІПУННІКАЎ**. — У выпадку, калі агенцтва заключае дагавор на выезд кліентаў, яно рызыкуе сваім прыбыткам. Таму я лічу, трэба забараніць практыку, калі агент напрамую супрацоўнічае з замежным аператарам.

Ігар Чорназіпуннікаў прыводзіць яшчэ адно цікавае назіранне: Нацыянальнае агенцтва па турызме мае значны спіс зарэгістраваных турыстычных фірмаў. Але тут ёсць нюанс — за афармленне сертыфікацыі трэба заплаціць. Атрымліваецца, чым больш сертыфікатаў, тым большы прыбытак у агенцтва. На думку дырэктара тураператарскай кампаніі, неўрэгуляваная сістэма выдачы сертыфікатаў не садзейнічае якасці паслуг.

За час бязвізавага рэжыму ў Гродне, напрыклад, узнікла каля 80 новых турыстычных кампаній, якія атрымалі сертыфікацыю. Што датычыцца прафесіяналізму «наваспечаных» фірмаў — тут пытанне адкрытае.

Зрэшты, як слушна заўважыў адзін з удзельнікаў круглага стала, кожная з прапаноў па развіцці беларускага турызму мае свае перавагі і недахопы. І каб вызначыць найбольш дзейсныя інструменты, патрэбна нарада спецыялістаў. А пакуль — пачакаем збору рабочай групы.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

# ТРОХХВІЛІННЫ ГІД ПА МІНСКУ

## стварыў аўстралійскі рэсурс для падарожнікаў Traveler

**Ён размясціў кароткі даведнік па Мінску, які расказвае, якія мясціны варта наведаць у беларускай сталіцы і што пакаштаваць у мясцовых кафэ і барах, паведамляе БелТА.**



У матэрыяле, які аўтар назваў трохвілінным гідам па Мінску, адзначаецца, што з улікам дзеяння бязвізавага рэжыму для грамадзян 80 краін, уключаючы Аўстралію, зараз найлепшы час для наведвання Беларусі.

Аўстралійская журналістка расказвае, што Мінск — гэта чысты і сучасны горад з моднымі кафэ, барамі і галерэямі. У той жа час тут захавалася шмат архітэктуры савецкага перыяду, але ў беларускай сталіцы адчуваецца энергія прагрэсу. Рыхтуючыся да правядзення Еўрапейскіх гульняў 2019 года і чэмпіянату свету па хакеі 2021, Мінск рухаецца наперад: будуюцца новыя гатэлі, развіваецца інфраструктура, з'яўляецца ўсё больш забаў.

Выданне рэкамендуе падарожнікам, якія прыехалі ў Мінск, наведаць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны мастацкі музей, а таксама музей «Краіна міні», дзе цяпер налічваецца 18 унікальных мініяцюр славутасцяў Беларусі, а да 2022 года колькасць экспанатаў плануецца павялічыць да 70.

Каб азнаёміцца з архітэктурай савецкай эпохі, варта прагуляцца па праспекце Незалежнасці. Прагаладаўшыся — зазірнуць у кафэ і пакаштаваць дранікі з дамашняй каўбасой, ячэйняй і зялёнай цыбуляй. Можна таксама адправіцца на ажыўленую вуліцу бараў і рэстаранаў — Зыбіцкую. Тым, хто хоча набыць беларускія лясныя ягады ці, напрыклад, вэнджанае мяса, аўтар рэкамендуе з'ездзіць на Камароўскі рынак.

Пасяліцца турыстам раяць у гатэлі «Манастырскі», які размясціўся ў гістарычным будынку ў самай атмасферной частцы старога горада. «Свята-Духаў кафедральны сабор, за некалькі крокаў рака Свіслач з яе набярэжнай, кафэ і пешаходнымі дарожкамі — вам цяжка будзе знайсці лепшае месца», — піша аўтар.

Акрамя таго, уразіла журналістку Traveler вуліца Кастрычніцкая, дзе старыя складскія памяшканні ператварыліся ў цэлы квартал вулічнага мастацтва.

А каб убачыць горад з вышыні, яна раіць пракаціцца на коле агляду ў парку імя М. Горкага.

У спіс так званых must do, то-бок рэчаў, якія абавязкова трэба зрабіць падчас наведвання Мінска, аўстралійская журналістка ўнесла два пункты. Па-першае, яна раіць пакаштаваць беларускія напоі, напрыклад бальзам, настоены на травах. Пры гэтым варта зайсці ў класічны бар савецкіх часоў ва ўніверсаме «Цэнтральны». Па-другое, абавязкова правесці вечар у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі — адным з самых вялікіх тэатраў Еўропы.

■ У зоне рызыкі

# СПЯКОТА: КАМУ ПАГРАЖАЕ ІНФАРКТ?

## 10 прыкмет таго, што ваша сэрца ў небяспецы




**Метэаролагі ўжо збіліся з ліку, рэгіструючы новыя і новыя температурныя рэкорды гэтага лета. Спякота пакуль не збіраецца пакідаць тэрыторыю Беларусі, і, хутчэй за ўсё, яшчэ не раз у жніўні тэрмометры будуць паказваць 29—31 градус днём і 19—20 градусаў уначы.**

Экстрэмальная спякота — гэта найперш нагрузка на сэрца, і чым даўжэй надвор'е будзе дэманстраваць падобныя «трапічныя» выкрутасы, тым мацней гэта адаб'ецца на нашым «палымяным маторы». Прычын гэтаму некалькі.

● Любы арганізм рэагуе на спякоту расшырэннем сасудаў і, адпаведна, крывяны ціск падае. Каб захаваць пры гэтым нармальны краваток, сэрцу даводзіцца працаваць ва ўзмоцненым рэжыме, практычна на мяжы сваіх магчымасцяў.

● У спякоту цела губляе шмат вадкасці, а разам з ёй і мінеральных соляў. Тым часам калій і магній, напрыклад, неабходны для падтрымання сардэчнага рытму, і пры сур'ёзным парушэнні водна-солевага балансу ў арганізме сэрца чалавека можа проста спыніцца.

● Наступствам абязводжвання таксама становіцца згушчэнне крыві. Яно значна павялічвае рызыку ўтварэння тромбаў, а значыць, і ўзнікнення ўсіх звязаных з гэтым праблем. Узрастае рызыка інфарктаў, інсультаў, лёгачнай эмбаліі і іншага.

Рэакцыяй нашай сардэчна-сасудзістай сістэмы на спякоту ў асноўным і тлумачацца дрэнная самаадчуванне, задышка і пастаянная стомленасць. Зрэшты, такімі «лёгкімі» наступствамі могуць абысціся толькі адносна здаровыя людзі. А вось тым, у каго ўжо ёсць праблемы з сэрцам ці схільныя да іх станы, можа паграджаць як мінімум абвастрэнне захворвання, як максімум — інфаркт з усімі наступствамі. І нават калі раней праблем з «галоўнай помпай» у вас не было, шэраг фактараў у спалучэнні з капрызамі надвор'я могуць справакаваць бяду. Згодна з інфармацыяй Амерыканскай кардыялагічнай асацыяцыі, такіх фактараў 10.

1. **Узрост.** У агульнай колькасці пацыентаў, якія памерлі ад тых ці іншых сардэчных хвароб, 83 % складаюць людзі, старэйшыя за 65 гадоў. Зрэшты, урачы кажуць, што ў апошнія гады той жа інфаркт істотна «памаладзеў». Усё часцей сустракаюцца падобныя праблемы ў мужчын каля 35—40. Для жанчын гэты парог крыху вышэйшы, але ён таксама паступова апускаецца.

2. **Пол.** У мужчын сардэчна-сасудзістыя хваробы не толькі пачынаюцца раней, але і заканчваюцца горш. У структуры смяротнасці ад інфарктаў прадстаўнікі дужага полу складаюць большасць — магчыма, з-за шкодных звычак і недастатковай увагі да свайго здароўя.

Некаторыя ўрачы таксама звязваюць гэтую залежнасць з уплывам пэўных палавых гармонаў на арганізм. Гэту тэорыю пацвярджае той факт, што ў жанчын рызыка інфаркту прыкметна ўзрастае пасля наступлення менапаўзы, гэта значыць пасля сур'ёзных гарманальных змен. Аднак першынство ў сумнай статыстыцы ўсё роўна належыць дужаму полу.

3. **Сямейны анамнез.** Лічыце, што ў вас з'явілася лішняя нагода пацікавіцца здароўем сваіх блізкіх. Калі ў кагосьці з іх ёсць сардэчна-сасудзістыя хваробы, вы таксама знаходзіцеся ў групе рызыкі.

4. **Ра́са.** Гэты пункт, напэўна, не павінен выклікаць занепакоенасць у большасці жыхароў нашай краіны. Згодна з міжнароднай статыстыкай, сардэчна-сасудзістыя хваробы найчасцей характэрныя для выхадцаў з Афрыкі, Азіі і Лацінскай Амерыкі.

5. **Курэнне.** Гэта шкодная звычка негатыўна ўплывае на склад крыві, перашкаджае яе насычэнню кіслародам, павышае ўзровень халестэрыну і правакуе тромбаўтварэнне. У выніку рызыка якіх-небудзь праблем з сардэчна-сасудзістай сістэмай узрастае ў 2—4 разы ў залежнасці ад тэрміну курэння і наяўнасці спадарожных захворванняў.

6. **Узровень халестэрыну.** «Страшылкі» пра халестэрынавыя бляшкі зараз вядомыя, напэўна, усім. Чым больш у вашай крыві «дрэннага» халестэрыну, тым большая рызыка закупорвання сасудаў і, адпаведна, інфаркту. Акрамя ўжо названага курэння, павышэнню ўзроўню халестэрыну садзейнічаюць гіпадынамія (адсутнасць фізічнай актыўнасці) і няправільнае харчаванне з вялікай колькасцю жывёльных тлушчаў.

7. **Крывяны ціск.** Усе гіпертонікі ведаюць пра патэнцыйную небяспеку такога стану, але далёка не кожны падазрае, што ён гіпертонік. Калі вы ніколі не клапаціліся аб узроўні свайго ціску, зараз час пра гэта задумацца, бо гіпертанія павышае нагрузку на сэрца, патанчае і аслабляе крывяныя сасуды і можа выклікаць інфаркты, інсульты і адмову нырак.

8. **Сядзячы лад жыцця.** Павышае рызыку ішэмічнай хваробы сэрца, а таксама правакуе іншыя захворванні, якія адбіваюцца на стане сардэчна-сасудзістай сістэмы. Як паказалі даследаванні брытанскіх кардыёлагаў, усяго 20 хвілін фізічнай актыўнасці ў суткі зніжаюць шанцы зарабіць інфаркт на 25—30 %.

9. **Лішняя вага.** Асабліва небяспечныя лішнія тлушчавыя адклады ў раёне таліі і жывата. Людзі, якія валодаюць такім «грузам», больш схільныя да сардэчна-сасудзістых захворванняў з летальным канцом нават пры адсутнасці іншых фактараў рызыкі. Прычым страта вагі мае тэрапеўтычны эфект: кожны скінуты з таліі сантыметр змяншае шанцы на раннюю смерць на 6-7 %.

10. **Дыябет.** Самай частай прычынай смерці дыябетыкаў з'яўляюцца тыя ці іншыя праблемы з сэрцам ці сасудамі (паводле статыстыкі, гэта каля 75 % выпадкаў) ■

### ЯК ПАВОДЗІЦЬ СЯБЕ Ў СПЯКОТУ, КАЛІ ЁСЦЬ ПРАБЛЕМЫ З СЭРЦАМ

**Калі вы ўваходзіце ў групу рызыкі, прытрымлівайцеся некалькіх простых правілаў бяспекі ў спякоту.**

● Менш працуйце. Усю больш-менш сур'ёзную фізічную актыўнасць варта па магчымасці адкласці. Не цягніце цяжкія сумкі, не рабіце доўгіх прагулак па спякоце і, канешне, пакіньце ў спакоі дачныя градкі. Апошнія, дарэчы, найбольш небяспечныя: калі вы згінаецеся, то і без таго аслаблены адток крыві ад галавы падае — і вы можаце страціць прытомнасць проста ў агародзе.

● Бойцеся халоднай вады. Гэта датычыцца і гарадскіх вадаёмаў, і звычайнага душа, і фантанаў, і іншых. Пры рэзкім перападзе тэмператур расшыраныя крывяносныя сасуды звужаюцца, фактычна адбываецца іх спазм, а гэта можа выклікаць прыступ стэнакардыі і нават інфаркт.

● Не знаходзьцеся на сонцы даўжэй за 15—20 хвілін запар. Калі адчуваеце задышку і частае сэрцабіцце, схавайцеся ў цень ці прахалодное памяшканне.

● Піце мінеральную ваду. Яна дапаможа арганізму эфектыўна ахалоджвацца праз потаадддзяленне і ў той жа час падтрымае нармальны водна-салявы баланс у цэлым.

● Не наядайцеся. Ежа, якая цяжка пераваўляецца, накшталт мяса і тлустай выпечкі, узмацняе нагрузку на страўнікава-кішачны тракт і крывяносную сістэму. Лепш больш ужываць водазмяшчальнай агародніны і фруктаў. Асабліва добрыя ў гэтым плане кавуны, капуста і агуркі.

■ Скажыце, доктар...

# Чым небяспечны нізкі ціск,

## або Не варта зайздросціць гіпатонікам



**Для многіх галаўным болем становіцца высокі ціск. Аднак ёсць людзі, у якіх адваротная праблема: гіпатонікі вымушаныя змагацца з нізкім ціскам. Пастаянныя яго спадарожнікі — санлівасць і слабасць — робяць жыццё няпростым, а часам і невыносным. У той жа час ёсць людзі, якія сцвярджаюць, што з нізкім ціскам адчуваюць сябе цалкам камфортна. Ці трэба кантраляваць ціск у такім выпадку, што дапамагае яго павысіць і наогул гэта рабіць, чаму добры сняданак, фізічная актыўнасць і доўгі сон — найлепшыя сябры гіпатоніка, расказала ўрач-тэрапеўт вышэйшай катэгорыі 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі Мінска Алена ЛАПСАР.**

***— Алена Сяргееўна, які ціск можна назваць нізкім?***

— Нармальным для дарослага чалавека ў нас прынята лічыць ціск у межах ад 90/60 мм рт. сл. да 140/90. Калі лічбы ціску ніжэйшыя за 90/60, ён нізкі. Калі гэтыя лічбы ўтрымліваюцца працяглы час, такіх людзей адносяць да гіпатонікаў.

***— Ці можна адрозніць гіпатонікаў па знешнім выглядзе?***

— Як правіла, гэта маладыя астэнізаваныя жанчыны.

***— З узростам ціск у гіпатонікаў павышаецца? Калі гэта адбываецца?***

— Для жанчын такія змены характэрныя, як правіла, пасля родаў, ціск становіцца больш стабільным. Часам нізкія лічбы ціску захоўваюцца на працягу дзесяцігоддзяў. І толькі ў перыяд клімаксу становіцца больш высокімі. Прычым, як паказвае практыка, многія такія жанчыны становяцца гіпертонікамі, лічбы іх ціску даволі высокія і цяжка карэгіруюцца.

***— Які ціск для гіпатоніка лічыцца высокім?***

— Калі ўвесь час сісталічны ціск ніжэйшы за 90 мм рт. сл., то яго павышэнне да 130, а часам нават і да 120 можа выклікаць у гіпатоніка гіпертанічны крыз. Урач, канешне, павінен рэагаваць не на лічбы, якія ў дадзеным выпадку адпавядаюць норме, а ўлічваць індывідуальныя асаблівасці пацыента. А апошні, у сваю чаргу, павінен паведаміць доктару, што мае звычайна нізкі ціск.

***— Як сябе адчуваюць людзі з нізкім ціскам?***

— Слабасць, разбітасць, санлівасць іх частыя спадарожнікі. Такім пацыентам у першую чаргу неабходная фізічная актыўнасць. Яна выдатна трэніруе нашы сасуды і вяртае ціск у норму. Таму раніца ў гіпатоніка павінна пачынацца з зарадкі, а таксама з паўнавартаснага сняданку, які нельга ігнараваць. Акрамя гэтага, і самі пацыенты, і іх блізкія павінны ведаць, што гіпатонікі мусяць добра высыпацца. Важна спаць сем-восем, а лепш дзевяць гадзін. Дзённая сіеста — гэта для гіпатонікаў. Добра, калі ў іх ёсць магчымасць зрабіць днём перапынак, заплюшчыць вочы і калі не паспаць, то хоць бы колькі часу адпачыць. Акрамя гэтага, урачы для паляпшэння самаадчування прызначаюць адаптагены, жэньшэнь, элеўтэракок і іншыя сродкі, якія павышаюць ціск.

***— Кантрасны душ карысны для гіпатонікаў?***

— Ён карысны для ўсіх, у тым ліку і для гіпатонікаў, бо зноў-такі трэніруе нашы крывяносныя сасуды.

***— Таксама рэкамендуюць піць больш вадкасці...***

— Так, гэта спрыяе пад'ёму ціску. Але добры сняданак, пра які я казала, тут адыгрывае вызначальную ролю. Акрамя гэтага, важна прытрымлівацца рэжыму працы і адпачынку.

***— Есці гіпатонікам неабходна часцей?***

— Усім нам рэкамендуецца прымаць ежу чатыры-пяць разоў на дзень: гэта першы і другі сняданак, абед, падвячорак і вячэра. Але тут важна правільна ўспрымаць той жа другі сняданак: гэта кубак гарбаты і лустачка сыру (20—30 грамаў), або жменя арэхаў, або ёгурт. Пераядаць ні ў якім разе не варта.

***— Соль, як вядома, затрымлівае вадкасць у арганізме і спрыяе павышэнню ціску...***

— Таму звычайна сыр паляпшае самаадчуванне гіпатонікаў. Раней нават існавала такая рэкамендацыя: калі ўпаў ціск, з'ешці бутэрброд з вяндлінай ці сырам. Але не будзем забываць, што бутэрброды — не самая здаровая ежа, а вось сыр цалкам карысны ў дадзеным выпадку.

***— Гіпатонікі больш метэаадчувальныя, чым людзі з нармальным ціскам?***

— І гіпатонікі, і гіпертонікі адносяцца да метэаадчувальных людзей. Бараметрычныя перапады адбіваюцца і на нашых сасудах, таму, калі ёсць іх лабільнасць у бок нізкага ці высокага ціску, будзе і метэаадчувальнасць і з гэтай асаблівасцю давядзецца змірыцца.

***— Ці трэба гіпатонікам кантраляваць свой ціск?***

— Безумоўна. Калі ціск падае ніжэй за звыклыя лічбы, гэта нагода звярнуцца да ўрача.

***— Гіпатонікам варта імкнуцца да таго, каб павышаць ціск, нават калі яны адчуваюць сябе з ім нядрэнна?***

— Так. Ёсць лічбы нармальнага ціску, якія я называла, і да іх мы ўсе павінны імкнуцца ■

Матэрыялы падрыхтавала
Алена КРАВЕЦ.

## Проектная декларация на четырехэтажный жилой дом с помещениями социально-общественного назначения по адресу: Минский район, Сеницкий с/с, аг. Атолино в районе пер. Центральный

Информация о застройщике: потребительский домостроительный союз «Домостроитель», зарегистрированный 27.11.1998 г. Администрацией г. Ставрополя за № 0962/98, свидетельство о внесении записи в Единый государственный реестр юридических лиц о юридическом лице, зарегистрированном до 01.07.2002 г. серии 26 № 000805758, выдано 27.12.2002 г. Инспекцией МНС России по Промышленному району г. Ставрополя.

Адрес: 355047, Российская Федерация, г. Ставрополь, ул. Лермонтова, 239/2.

Инженерная организация, осуществляющая комплексное управление строительной деятельностью: ООО «Домостроитель-НВА», 223040, Республика Беларусь, Минская обл., Боровлянский с/с, аг. Лесной, ул. Фабричная, д. 2А, пом. 4/3, тел. + 375 44 741 27 69.

Режим работы: пн. – чт. с 9.00 до 18.00.

Обеденный перерыв: с 13.00 до 14.00.

В течение трех последних лет ПДС «Домостроитель» построено и введено в эксплуатацию три объекта жилищного назначения, в том числе:

– многоэтажный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями по адресу: Российская Федерация, г. Ставрополь, проспект Кулакова, 51, 1-я очередь, 180 квартир площадью 9664,8 кв. м, встроенно-пристроенные помещения площадью 5901,2 кв. м, сроки строительства 24.07.2015 г. – 31.12.2017 г.;

– 36-квартирный жилой дом по адресу: Российская Федерация, Московская обл., Ступинский р-н, д. Алфимово, 36 квартир площадью 1560 кв. м, сроки строительства 25.08.2015 г. – 31.12.2015 г.;

– многоэтажный жилой дом со встроено-пристроенными помещениями по адресу: г. Российская Федерация, г. Ставрополь, проспект Кулакова, 51, 2-я очередь, 97 квартир площадью 4484,1 кв. м, встроенно-пристроенные помещения площадью 2834,1 кв. м, сроки строительства 02.02.2017 г. – 31.03.2018 г.

Информация об объекте строительства:

Строительный проект при одностадийном проектировании предусматривает строительство 4-этажного жилого дома на 32 квартиры по генплану № 1 в северной части аг. Атолино Сеницкого сельсовета Минского района на пересечении улицы Западная и переулка Центрального.

Строительство жилого дома предусматривается по индивидуальному проекту.

